Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт
Кафедра ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі

Рэг № УМ(УМК)26-2-11/2022

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
________В.А.Йоцюс
30. 11. 2022 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
________С.П.Шупляк
________2022 г.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС**
**ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**

# НАВУКОВАЯ КРЫТЫКА ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦЫ

для спецыяльнасцяў
1-02 0101 Гісторыі і грамадазнаўчыя дысцыпліны
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

Складальнік: кандыдат гістарычных навук, дацэнт Калечыц І.Л.

Разгледжан і зацверджан на пасяджэнні Савета БДПУ
01. 12. 2022, пратакол № 3

**Змест**


ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ........................................................................... 3

ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ........................................................................... 4

Канспекты лекцый: ........................................................................... 4

ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ........................................................................... 23

Планы семінарскіх і практычных заняткаў ........................................................................... 23

РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ........................................................................... 30

Пытанні да заліку ........................................................................... 38

ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ........................................................................... 39

Гласарый........................................................................... 39

Вучэбная праграма ........................................................................... 41

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навуковая крытыка дае выпрацаваныя дасведчаным шляхам правілы, як трэба ставіцца да вестак, якія змяшчаюцца ў гістарычных крыніцах розных катэгорый. Пад гістарычнай крыніцай даследчыкі разумеюць усе рэшткі мінулага, якія звязаныя з дзейнасцю людзей і адлюстроўваюць гісторыю і заканамернасці развіцця чалавечага грамадства. Гістарычныя крыніцы могуць быць пісьмовымі і рэчавымі. Для працы з імі выкарыстоўваюцца дапаможныя гістарычныя дысцыпліны, якія накіраваны на вывучэнне гістарычнай крыніцы, а праз гэта – на вызначэнне дакладнасці гістарычнага факта, які змяшчаецца ў ёй.

Паспяховае прымяненне навуковай крытыкі гістарычнай крыніцы магчыма толькі пры атрыманні навыкаў працы з крыніцай, выкарыстанне спецыфічных методык і тэхнічных прыёмаў, валоданне якімі неабходна гісторыку.

Мэта вучэбна-метадычнага комплекса "Навуковая крытыка гістарычнай крыніцы" – авалоданне галоўнымі тэарэтычнымі і практычнымі метадамі і прыёмамі даследавання пісьмовых і рэчавых гістарычных крыніц.

Задачы вучэбна-метадычнага комплекса**:**

- засваення навыкаў чытання і палеаграфічнага аналіза пісьмовых помнікаў як гістарычных крыніц;
- авалодання ведамі ў галіне храналогіі, метралогіі, нумізматыкі, анамастыкі, антрапанімікі, тапанімікі, геральдыкі, сфрагістыкі і ўменнямі выкарыстоўваць іх пры вывучэнні гістарычных крыніц;
- авалоданне ўменнямі выкарыстоўваць даныя навуковай крытыкі гістарычнай крыніцы для арганізацыі вучэбнай і пазакласнай працы настаўніка гісторыі і ў працы гісторыка-вучонага.

ВМК па "Навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы" складаецца з тэарэтычнага раздзелу, які ўключае ў сябе тэмы лекцый па дысцыпліне; практычнага раздзелу, які ўключае планы семінарскіх і практычных заняткаў; раздзел кантроля ведаў, дзе змешчаны матэрыялы для бягучага, прамежкавага і выніковага кантролю вучэбных дасягненняў (тэсты, задачы, пытанні да экзамену); дапаможнага раздзелу, які ўключае: праграмна-плануючую дакументацыю (вучэбная праграма).

У цэлым ВМК "Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны" спрыяе развіццю прафесійнай эрудыцыі і фарміраванню даследчых навыкаў студэнтаў, неабходных для працы ў навуковых і адукацыйных установах рознага ўзроўню.

# ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## Канспекты лекцый:

### Лекцыя 1. Паняцце гістарычнай крыніцы. Пісьмовыя і рэчавыя крыніцы.

Ключавыя паняцці: гістарычная крыніца, рэчавая крыніца, пісьмовая крыніца.

1. Паняцце гістарычнай крыніцы.
2. Рэчавыя і пісьмовыя крыніцы.

1.Паняцце гістарычнай крыніцы. Неад'емную частку працы гісторыка састаўляе даследчая работа, у працэсе якой ён вывучае вялікую колькасць гістарычных крыніц. *Гістарычная крыніца* – гэта ўсе рэшткі мінулага, якія звязаны з дзейнасцю людзей і адлюстроўваюць гісторыю чалавечаскага грамадства.

2.Крыніцы падзяляюцца на пісьмовыя і рэчавыя. Рэчавыя крыніцы здабываюцца падчас археалагічных даследаванняў. Яны даследуюцца з дапамагай спецыяльных метадаў. Рэчывыя крыніцы – створаныя чалавецтвам з моманту яго з'яўлення матэрыяльныя (якія можна памацаць рукамі) прадметы. Рэчавыя крыніцы, аднак, не дазваляюць поўнасцю апісаць гістарычную падзею. Да пісьмовых крыніц адносяцца: дакументы, аналы, гістарычныя даследаванні, мемуары, іншыя літаратурныя творы. Матэрыялам для пісьмовых крыніц служыць усё, на чым можна пісаць: папера, скура (пергамент), папірус, дрэва і драўняная кара, косць, гліна, камень, метал.

Пытанні да лекцыі

1. Што такое гістарычная крыніца?
2. На якія групы падзяляюцца гістарычныя крыніцы.

Літаратура


1. Абрамова Н.Г. Вспомогательные исторические дисциплины / Н.Г. Абрамова, Т.А. Круглова. – 2-е изд, исправленное. – Москва: Академия, 2011. – 368 с.
2. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна- метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.
3. Леонтьева Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины / Г.А. Леонтьева, П.А. Шорин, В.Б. Кобрин. – 2-е изд., исправленное и дополненное. – Москва: Владос, 2015. – 380 с.


### Лекцыя 2. Роля дапаможных гістарычных дысцыплін у вывучэнні гістарычнай крыніцы.

Ключавыя паняцці: палеаграфія, эпіграфіка, кадзікалогія, храналогія, метралогія, нумізматыка, геральдыка, сфрагістыка, генеалогія, анамастыка, археаграфія, дыпламатыка, філіграналогія, баністыка, фалерыстыка, вексіалогія, гістарычная геаграфія.

План

1. Паняцце гістарычнай крыніцы.
2. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны ў сістэме гістарычных навук.
3. Прычыны ўзнікнення і развіццё дапаможных гістарычных дысцыплін.
4. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны як навукі. Умоўнасць назвы.
5. Выкарыстанне дапаможных гістарычных дысцыплін у працы настаўніка гісторыі.

Канспект лекцыі:

1. Для работ з гістарычнымі крыніцамі даследчыкамі выкарыстоўваецца шэраг дапаможных гістарычных дысцыплін, сярод якіх можна вызначыць палеаграфію, эпіграфіку, кадзікалогію, храналогію, метралогію, нумізматыку, геральдыку, сфрагістыку, генеалогію, анамастыку, археаграфію, дыпламатыку, філіграналогію, баністыку, фалерыстыку, вексіалогію, гістарычную геаграфію. *Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны* – гэта дысцыпліны, якія вывучаюць асобныя віды гістарычных крыніц ці сукупнасць гістарычных крыніц з пункту гледжання азначанай праблемы.

2. Прычыны ўзнікнення і развіццё дапаможных гістарычных дысцыплін. Усе дапаможныя гістарычныя дысцыпліны з пачатку свайго існавання мелі так званы “практычны” характар. Таму некаторыя з метадаў і прыёмаў даследавання, якімі карыстаюцца вучоныя, з’явіліся значна раней, чым дапаможныя гістарычныя дысцыпліны сталі афармляцца як навука. З накапленнем ведаў і матэрыяльных крыніц па той ці іншай дысцыпліне вывучэнне дапаможных гістарычных дысцыплін стала насіць прыкладны характар. Пераломным момантам для дапаможных гістарычных дысцыплін стаў 1917 г. Зноў выкладанне дапаможных гістарычных дысцыплін было ўведзена ў пачатку 30–х гг. XX ст. Нягледзечы на некаторыя хібы, з другой паловы XX ст. пачынае расці колькасць гістарычных даследаванняў з шырокім выкарыстаннем матэрыялаў і метадаў цэлага раду дапаможных гістарычных дысцыплін.

3. З цягам часу дапаможныя гістарычныя дысцыпліны пераўтварыліся ў самастойныя навукі. Гэта можна сцвярджаць таму, што ўсе яны маюць прыкметы самастойных навук. Яны маюць сваю вобласць даследавання, а таксама спецыяльныя методыкі і тэхнічныя прыёмы даследавання, якія выкарыстоўваюцца для задач, у асноўным, знешняй крытыкі крыніцы: вызначэнне часу, умоў і месца узнікнення крыніцы, яе аўтара або ўладальніка, вызначэння сапраўднасці крыніцы, аднаўленне згубленых частак і першапачатковага зместу. Традыцыйнасць і ўмоўнасць назвы выклікана тым, што для гістарычнага пазнання гэтыя дысцыпліны маюць не дапаможны, а хутчэй, базісны характар. Улічваючы разыходжанне паміж назвай і сутнасцю дапаможных гістарычных дысцыплін як комплекса самастойных навук, традыцыйна захоўваецца назва “дапаможныя гістарычныя дысцыпліны”, якая ўзнікла ў XIX ст. пры захаванні некаторай умоўнасці гэтай назвы.

4. Выкарыстанне дапаможных гістарычных дысцыплін у працы настаўніка

гісторыі. Яшчэ Л.В. Чарапнін заўважыў, што узровень развіцця дапаможных істарычных дысцыплін у значнай меры вызначае ступень прафесіянальнага майстэрства, якое праяўляецца ў гістарычных даследаваннях. Акрамя таго, што веданне дапаможных гістарычных дысцыплін неабходна ў працы вучонага-гісторыка, іх можна выкарыстоўваць у рабоце настаўніка гісторыі ў працэсе вывучэння курсаў сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі, а таксама ў пазакласнай рабоце – стварэнні школьнага гісторыка-краязнаўчага музея, правядзенні экскурсій, а таксама правядзенні заняткаў у гістарычным гуртке і іншых відах работы. Веданне дапаможных гістарычных дысцыплін можа значна актывізаваць вучэбна працэс. Дэманстрацыя і добрае веданне тэкстаў, манет, гербаў і іншага нагляднага матэрыяла, які выкарыстоўваецца на ўроку, можа значна палепшыць успрыманне вучэбнага матэрыялу.

Пытанні па матэрыялу лекцыі:

3. Што такое гістарычная крыніца?
4. Якія навукі ўваходзяць у склад дапаможных гістарычных дысцыплін?
5. Якія этапы прайшлі дапаможныя гістарычныя дысцыпліны?
6. Чаму назва дапаможныя гістарычныя дысцыпліны з’яўляецца ўмоўнай?
7. Як можна выкарыстовываць дапаможныя гістарычныя дысцыпліны на уроках гісторыі?

Літаратура


4. Абрамова Н.Г. Вспомогательные исторические дисциплины / Н.Г. Абрамова, Т.А. Круглова. – 2-е изд, исправленное. – Москва: Академия, 2011. – 368 с.
5. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна- метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.
6. Леонтьева Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины / Г.А. Леонтьева, П.А. Шорин, В.Б. Кобрин. – 2-е изд., исправленное и дополненное. – Москва: Владос, 2015. – 380 с.


## Лекцыя 3. Палеаграфія і яе значэнне для вывучэння гістарычнай крыніцы.

Ключавыя паняцці: палеаграфія, прадмет палеаграфіі, аб’ект палеаграфіі, метады палеаграфіі, задачы палеаграфіі, грамата, летапіс, рукапісная кніга, протакірыліца.

План

1. Прадмет, задачы і метады палеаграфіі. Крыніцы вывучэння палеаграфіі. Сувязь з іншымі навукамі.
2. Гісторыя развіцця палеаграфіі.
3. Пісьменнасць ўсходніх славян у дахрысціянскі перыяд.

1. *Палеаграфія* – дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая займаецца вывучэннем знешніх прызнакаў помнікаў пісьменнасці. Назва навукі ўтварылася

ад слоў “палайос” (παλαιός) – старажытны і “графа” (γράφω) - пішу. *Прадметам* даследавання палеаграфіі з’яўляюцца *знешнія прыкметы* рукапісных крыніц: графіка літар, аздабленне рукапісаў, спосабы афармлення тэкстаў, асабістыя знакі, а таксама матэрыял, выкарыстаны для пісьма, прылады пісьма, вадзяныя знакі. *Аб’ектам* вывучэння палеаграфіі з’яўляецца гісторыя пісьменнасці як заканамерная з’ява ў жыцці грамадства, якая звязана з яго сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурным развіццём. Палеаграфія вывучае не толькі і не проста знакі пісьма і іх формы, а змены ў грамадстве, якія праяўляюцца ў гэтых знаках і формах. Асноўнай задачай палеаграфіі з’яўляецца *вывучэнне знешняга боку пісьма*, што ўключае ў сябе вывучэнне графікі літар, іх паходжання і эвалюцыі, асаблівасцяў напісання. Задачамі палеаграфіі з’яўляюцца таксама *чытанне і дацыроўка тэкстаў, вызначэнне аўтара тэксту, вызначэнне сапраўднасці* або *падробленасці* тэксту, вызначэнне *месца напісання* тэксту, а таксама, калі гэта магчыма, вызначэнне пратографа і спіса. *Крыніцамі* вывучэння палеаграфіі з’яўляюцца летапісы, рукапісныя кнігі, граматы. Метад палеаграфічнага даследавання складаецца з двух этапаў: назіранне за знешнімі прызнакамі пісьмовай крыніцы і датаванне гэтай крыніцы ў адпаведнасці з гэтымі прызнакамі, а таксама ўстанаўленне, калі гэта магчыма, месца стварэння, аўтарства і сапраўднасці крыніцы. У рамках дапаможных гістарычных дысцыплін палеаграфія звязана з эпіграфікай, сфрагістыкай і нумізматыкай, храналогіяй, філіграналогіяй, дыпламатыкай, тыпаграфікай.

2. Тэрмін “палеаграфія” ўпершыню быў выкарыстаны ў 1708 г. французскім гісторыкам Бернарам дэ Манфаконам у працы “Грэчаская палеаграфія”. Да таго як аформіцца ў навуковую дысцыпліну, палеаграфічныя метады насілі прыкладны характар: была патрэба ў адрозненні сапраўдных дакументаў ад падробак (асабліва з XV ст.). Такі “практычны” перыяд доўжыўся да XVIII ст. З XVIII да сярэдзіны XIX ст. назіраецца “апісальны” перыяд палеаграфічных даследаванняў, які характэрызуецца з’яўленнем інтарэсу да рукапісных крыніц, вялікая колькасць якіх была выяўлена і апублікавана. У сувязі з гэтым з’явіліся даследаванні А.Н. Аленіна, К.Ф. Калайдовіча, А.Х. Вастокава. Спецыяльным даследаваннем па беларускай кірылаўскай палеаграфіі з’явілася праца С.Я. Куль-Сяльверставай “Беларуская палеаграфія”. На значна новы ўзровень вывядзена беларуская палеаграфія ў падручніку А. Грушы “Беларуская кірылічная палеаграфія”.

3. Няма сумненняў, што ў славян да кірыліцы існавала пісьмо. Сведчаннем таму з’яўляюцца шматлікія знаходкі з пісьмёнамі, якія ў наш час з’яўляюцца нечытэльнымі і патрабуюць сістэматызацыі і вывучэння. Аб існаванні пісьменнасці ў славян дакладна вядома з візантыйскіх крыніц, а таксама крыніц, напісаных арабскімі аўтарамі Ібн Фадланам, Эль Масудзі, Ібн- Якуб эль Недзімам у X ст. Згодна візантыйскіх крыніц, тэкст грамат-дагавораў 907 і 911 гг. быў састаўлены на двух мовах, грэчаскай і старажытнаславянскай, якую

выкарыстоўвалі русы. Таксама прыгадванне аб старажытнай славянскай пісьменнасці ёсць у творы “Сказанне пра пісьмены” чарнарызца Храбра (канец IX-пачатак X ст).Такім чынам, славяне карысталіся для чытання і варажбы знакамі ў выглядзе рысак і надрэзаў, якія відаць, мелі рунападобную форму для лёгкага нанясення іх на цвёрдыя паверхні: бяросту, дрэва, камень. Па сведчанні таго ж чарнарызца Храбра, потым славяне карысталіся лацінскімі і грэчаскімі літарамі “без устроения”, што значыць не дакладна, а відаць толькі для фанетычнай перадачы гукаў. Такое запазычанне звязана з развіццём гандлёвых і культурных сувязяў славян з Візантыяй, а таксама прыняццем хрысціянства асобнымі абшчынамі славян. Гэта запазычанне мае назву протакірыліцы.

Пытанні па матэрыялу лекцыі:

1. Што вывучае палеаграфія? Назваць прадмет, аб’ект, метады, задачы палеаграфіі? Крыніцамі вывучэння палеаграфіі з’яўляюцца?..

2. Кім і калі было зроблена першае ужыванне тэрміна палеаграфія? Якія этапы прайшло вывучэнне палеаграфіі?

3. Назавіце важнейшых сведкаў існавання дакірылічнай пісьменнасці? Што такое протакірыліца?

Літаратура:

1. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна- метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.
2. Леонтьева Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины / Г.А. Леонтьева, П.А. Шорин, В.Б. Кобрин. – 2-е изд., исправленное и дополненное. – Москва: Владос, 2015. – 380 с.

**Лекцыя 4. Герб як гістарычная крыніца.**

Ключавыя паняцці: геральдыка, герольд, герб, блазаніраванне, шрафіроўка, шчыт, фігуры дзялення, геральдычныя і негеральдычныя фігуры, эмалі, металы, футры, карона, шлем, нашлемнік, бурэлет, намёт, шчытатрымальнікі, мантыя, дэвіз.

План:

1. Геральдыка як навука.
2. Знешнія і ўнутраныя прычыны з’яўлення геральдыкі.
3. Інстытут герольдаў
4. Паняцце герба.
5. Разнавіднасці гербаў

6. Тэарэтычная геральдыка. Блазаніраванне герба. Шчыт. Яго разнавіднасці. Фігуры дзялення, геральдычныя фігуры, эмалі, металы і футры. Карона, шлем, нашлемнік, бурэлет, намёт, шчытатрымальнікі, мантыя, дэвіз.

1. Геральдыка – гэта дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае дзяржаўныя, гарадскія, асабовыя гербы, а таксама гербы ўстаноў і аб’яднанняў, а таксама займаецца іх апісаннем і стварэннем новых гербоў па

строга акрэсленых правілах.

2. З’яўленне геральдыкі мае як знешнія, так і ўнутраныя прычыны. Галоўнай са *знешніх прычын* з’яўляецца выкарыстанне рыцарамі удасканаленнай зброі – жалезных даспехаў, якія скасоўвалі індывідуальныя адрозненні паміж рыцарамі. *Унутранымі прычынамі* распаўсюджання гербоў з’яўляюцца развіццё феадальнай сістэмы, а таксама жаданне захаваць памяць аб вядомых падзеях і подзвігах для сваіх нашчадкаў.

3. Існаванне гербаў дало падставу для ўзнікнення інстытута герольдаў. З XIII ст. ролю герольдаў выконвалі гербавыя зброяносцы. З XIV ст. роля герольдаў трошкі змянілася. Імі станавіліся людзі ваеннага звання, якія састаялі пры дварах высокапастаўленых асоб і выконвалі абавязкі дыпламатычнага характару. У наступныя стагоддзі яны ўтвараюць карпаратыўныя арганізацыі. А к XVIII ст. званне герольда пераўтвараецца ў ганаровую пасаду. Герольды існуюць да сённяшніх дзён у краінах, дзе працягваецца традыцыя захавання, стварэння і гербоў.

4. *Герб* – гэта сімвалічная вызначальна-прававая выява, прадстаўленая на падставе вядомых, дакладна акрэсленых правілаў, якая служыць пастаянным знакам адрознення асабістаму ліцу, роду, згуртаванню або ўстанове, вобласці ці дзяржаве, і зацверджаная дзяржаўнай уладай.

5. У залежнасці ад таго, каму належыць герб, іх можна падзяліць на наступныя групы: *дзяржаўныя, мясцовыя, згуртаванняў, фамільныя, радавыя, уласныя, саюзныя* або *шлюбныя, спадчынна-уладальніцкія, дамагання, апякунства* або *падаравання, набожнасці, службовыя, спрадвечныя, дараваныя.* У залежнасці ад выяў*: галосныя* або *імянныя, загадкавыя* ці *энігматычныя*. У залежнасці ад ўчынкаў герб мог быць *поўны* і *зменены*.

6. Поўны герб складаецца са шчыта і знешняй часткі. Шчыт змяшчае фігуры дзялення, геральдычныя і негеральдычныя фігуры. Разнастайнасць шчытоў дасягаецца ўжываннем пяці эмаляў, двух металаў і двух футраў. Герб блазаніруецца ў наступным парадку: шчыт, карона, шлем, нашлемнік, бурэлет, намёт, шчытатрымальнікі, мантыя або сень, дэвіз або іншыя дэталі.

<u>Пытанні па матэрыялу лекцыі:</u>

1. Што вывучае геральдыка, дайце яе вызначэнне як навуковай дысцыпліны?.
2. Якая знешняя прычына з’яўляецца асноўнай для з’яўлення геральдыкі? Пералічыце ўнутраныя прычыны з’яўлення геральдыкі? З чым яны звязаны?
3. Як змяняліся функцыі герольдаў у залежнасці ад патрэб часу?
4. Які ўмовы неабходны для існавання герба?
5. Якія фактары ўздзейнічаюць на разнастайнасць і дзяленне гербоў?
6. Што такое блазаніраванне герба? Якія разнавіднасці герба, фігуры

дзялення, геральдычныя фігуры, эмалі, металы і футры вы ведаеце?

7. Для чаго выкарыстоўваюцца карона, шлем, нашлемнік, бурэлет, намёт, шчытатрымальнікі, мантыя, дэвіз?

Літаратура:


1. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.
2. Леонтьева Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины / Г.А. Леонтьева, П.А. Шорин, В.Б. Кобрин. – 2-е изд., исправленное и дополненное. – Москва: Владос, 2015. – 380 с.
3. Слейтер С. Геральдіка: іллюстрірованная энціклопедія / С. Слейтер. – Москва: Эксмо, 2005. – 264 с.


**Лекцыя 5.** ***Практычная геральдыка.***

Ключавыя паняцці: татэм, знакі Рурыкавічаў, уласныя гербы, разбор шляхты, гарадскія гербы, геральдычныя ўстановы, сімвал, эмблема

План:

1. Этапы развіцця геральдыкі. Дагеральдычны перыяд.
2. Уласныя, гарадскія, дзяржаўныя гербы, гербы аб'яднанняў.
3. Геральдычныя установы Рэспублікі Беларусь.
4. Метады і крыніцы аднаўлення і стварэння гербавай сімволікі.
5. Далейшыя напрамкі развіцця геральдыкі. Сімволіка і эмблематыка.

1. Існаванню ўласна геральдычных выяў – гербаў на тэрыторыі Беларусі папярэднічаў працяглы этап развіцця дагеральдычных выяў, шмат з якіх былі пазней пакладзены ў аснову геральдычных выяў. Было прасочана паступовае пераўтварэнне "абарончай канструкцыі" ў "татэмічную канструкцыю", а з яе – ў "прадстаўнічы знак". Да дагеральдычных выяў можна аднесці так званыя "знакі Рурыкавічаў", выявы якіх сустракаюцца таксама і на прадметах, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі. Існуе шмат версій наконт паходжання "знакаў Рурыкавічаў", якія прадстаўляюць сабой двузубцы ці трохзубцы, простыя ці з адгалінаваннямі.

2. Ужыванне ўласных гербаў пачынаецца ў Вялікім княстве Літоўскім з XIV ст. Адно з першых упамінанняў аб шляхецкіх гербах можна знайсці ў летапісах. Як вядома, падчас Гарадзельскай уніі 1413 г. паміж Вялікім княствам Літоўскім і Каралеўствам Польскім адбыўся абмен гербамі паміж шляхтай Княства і Кароны. Геапалітычнае становішча Беларусі прывяло да таго, што на тэрыторыі пражывання беларускага народу ў XVIII ст. шляхта складала 10% ад агульнай колькасці насельніцтва. Падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне тэрыторый да Расійскай імперыі сярод іншых пытанняў выклікалі і пытанні аб адрозненні стану шляхты расійскай і Рэчы Паспалітай. Пасля першага падзелу быў выдадзены ўказ ад 13 верасня 1772 г., які патрабаваў ад

шляхты прадставіць дакументы для доказу шляхетства. Далей ідуць указы 1800, 1812, 1816 г. 19 кастрычніка 1831 г. быў выдадзены ўказ Мікалая I аб "разборы шляхты", паводле якога ў якасці доказу шляхецкага паходжання маглі быць выкарыстаны толькі арыгіналы прывілеяў і грамат вялікіх князёў. Гэтыя працэсы перавялі значную колькасць шляхты ў "недаказаныя дваране", "не належачыя да дваранства", "па-за саслоўныя", што канешне адыграла адмоўную ролю на стане геральдыкі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. існаванне геральдыкі як навукі прыпынілася. Яе развіццё працягвалася пасля атрымання Рэспублікай Беларусь незалежнасці разам з усплёскам цікавасці да гістарычнага мінулага Беларусі. На сённяшні час налічваецца каля 600 разнавіднасцяў уласных гербоў.

На тэрыторыі Беларусі менавіта Полацку герб ў 1451 г. быў нададзены прывілеям караля Казіміра Ягелончыка. Так пачаўся *першы этап* надання гербоў беларускім гарадам. Увогуле статыстыка надання гербоў гэтага перыяду наступная: з вышэйзгаданага часу і да канца XVIII ст. каралеўскімі прывілеямі гарадам было нададзена ў XVI і XVII стст. па 14 гербоў і ў XVIII васемнаццаць. З XVIII ст. пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ўваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі пачаўся *другі этап* – геральдыка беларускіх гарадскіх гербоў нібыта пачынала існаваць нанова, перакрэсліўшы амаль ўсё, існаваўшае раней. Гербы гарадоў павінны былі паводле "Гарадавога палажэння" зацвярджацца ў Пецярбургу. Пры Кацярыне II геральдыстамі было створана яшчэ 15 гербаў для гарадоў, якія да гэтага часу імі не валодалі. У XIX ст. Мікалаям I былі падараваны гербы 11 гарадам.У другой палове XIX ст. былі зацверджаны гербы для губернскіх гарадоў Паўночна-Заходняга краю. *Трэці этап* беларускай гарадской геральдыкі можна лічыць пачаўшымся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі ўсе царскія указы, выдадзеныя раней, аўтаматычна страцілі сваю сілу. У пачатку 1960-гадоў гербы пачалі зацвярджацца мясцовымі органамі ўлады. Але гербамі гэтыя выявы можна назваць вельмі ўмоўна, яны не мелі пад сабой гістарычнай падставы. Пасля абвяшчэння Рэспублікай Беларусь незалежнасці пачаўся *чацвёрты этап* развіцця беларускай гарадской геральдыкі, які можна ахарактэрызаваць як этап адраджэння.

У наш час адбываецца адраджэнне традыцый карпаратыўнай сімволікі. Прыкладам таму могуць быць гербы універсітэтаў, факультэтаў, у прыватнасці, гербы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта і герб гістарычнага факультэта.

Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь зацверджаны ў 1995 г. ён прадстаўляе сабой сярэбранае поле, у якім змешчаны зялёны контур дзяржаўнай граніцы, які накладзены на залатыя промні ўзыходзячага сонца. Зверху – пяціканцовая зорка. Поле акружана вянком з залатых каласоў, якія пераплецены с правага боку кветкамі канюшыны, з левага – кветкамі ільну.

Вянок тройчы перавіты з кожнага боку чырвона-зялёнай стужкай. У сярэдняй частцы стужкі на аснаванні герба ў два радкі надпіс “Рэспубліка Беларусь”.

3. Геральдычная служба Рэспублікі Беларусь пачала існаваць пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікай Беларусь. Спачатку гэта был аддзел геральдычнай службы Камітэта па архівай і справаводству пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, створана пастановай Савета Міністраў № 603 ад 05.10.1992 г. З 1995 г. гэты аддзел пераўтвараецца ў аддзел геральдыкі і генеалогіі пад кіраўніцтвам канд. гіст. навук В.Л. Насевіча, а з 1998 г. пад кіраўніцтвам док. гіст. навук С.Я. Рассадзіна. У гэты час былі распрацаваны наступныя палажэнні: аб парадку аднаўлення гістарычнага або стварэння новага афіцыйнага герба і далейшай яго дзяржаўнай рэгістрацыі; аб Гербавым Матрыкуле Рэспублікі Беларусь. У гэты час вядзецца не толькі зацвярджэнне раней існаваўшых гербаў, але і стварэнне новых.

Геральдычны Савет Рэспублікі Беларусь створаны адпаведна з Указам № 441 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Г. Лукашенка “Аб стварэнні геральдычнага Савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і некаторых мерах па ўдасканаленню парадку зацвярджэння і дзяржаўнай рэгістрацыі ордэнаў, медалёў і афіцыйных геральдычных сімвалаў” ад 7 жніўня 2002 г. Паводле гэтага Указа ў Геральдычны рэгістр Рэспублікі Беларусь былі ўключаны 83 гербы, якія былі зарэгістраваны дзяржавай з 1991 па 2001 гг. Яны былі ўнесены ў Гербавы Матрыкул Рэспублікі Беларусь адпаведна з пастановай № 89 ад 22.02.1994 г. У кампетэнцыю Геральдычнага Савета ўваходзіць правядзенне экспертызы гербоў і сцягоў тэрытарыяльных і адміністрацыйных адзінак Рэспублікі Беларусь. Адна з галоўных задач Геральдычнага Савета – спрыянне развіццю афіцыйнай геральдыкі і сімволікі ў Рэспубліцы Беларусь, у тым ліку і шляхам распаўсюджвання інфармацыі сярод шырокіх колаў грамадскасці.

4. На жаль, помнікі геральдыкі, як і іншыя гістарычныя помнікі, подвержены страце, часам, незваротнай. Аднак ў радзе выпадкаў герб можна аднавіць або на падставе асобных захаваўшыхся звестак стварыць новы, набліжаны выявай да існаваўшага. Шляхі аднаўлення гербоў: страчаныя гербы аднаўляюцца па прывілеях; па выявах і апісаннях у працах краяведаў; па выявах на пячатках; па сваіх апісаннях – блазаніраваннях; на аснове герба колішніх уладальнікаў шляхам прыняцця часткі іх герба ў герб гарадоў. Развіваецца напрамак надання “галосных гербоў”, звязаных з назвамі гарадоў.

5. Далейшы напрамак развіцця геральдыкі абумоўлены тым, што паняцце герба звязана з паняццем лагатыпа. Развіццё лагатыпа цесна звязана з сімволікай і эмблематыкай. Некаторыя навукоўцы бачаць далейшае развіццё геральдыкі за кошт эмблематыкі – вывучэння знакаў новых сацыяльных утварэнняў, знакаў уласнасці, што абумоўлена эканамічным развіццём, у рамках якога прамысловая аб’яднанні, канцэрны, фірмы ўжываюць лагатыпы,

якія дапамагаюць адрозніваць прадукцыю гэтых вытворцаў. Сімвал – гэта ўмоўныя знакі, якія маюць прасцейшыя начартанні, якія адлюстроўваюць у абстрактным выглядзе тое ці іншае паняцце, звязанае з адпаведнымі ведамі. Эмблема – гэта выява, у якой зашыфравана ўмоўнае традыцыйнае значэнне. Здаецца слушным, што вывучэнне геральдыкі Беларусі на сучасным этапе павінна складацца з вывучэння старажытных беларускіх гербаў – гарадскіх, мескіх, прыватных, – недастаткова вывучаных у наш час.

Пытанні па матэрыялу лекцыі:

1. Якія этапы развіцця прайшла геральдыка? Чым геральдычныя выявы адрозніваюцца ад дагеральдычных? Што такое знакі Рурыкавічаў?

2. Што агульнага ў развіцці уласных і гарадскіх гербоў? Што характэрна для гербоў аб’яднанняў? Якія этапы прайшло станаўленне дзяржаўнага герба?

3. Назавіце геральдычную ўстанорву Рэспублікі Беларусь, якія этапы развіцця яна прайшла?

4. Якімі шляхамі аднаўляецца і ствараеца гербавая сімволіка?

5. Чым адрозніваюцца напрамкі развіцця заходнееўрапейскай і беларускай геральдыкі? Чым адрозніваюцца сімвал, эмблема і лагатып?

Літаратура:


1. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.
2. Леонтьева Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины / Г.А. Леонтьева, П.А. Шорин, В.Б. Кобрин. – 2-е изд., исправленное и дополненное. – Москва: Владос, 2015. – 380 с.
3. Слейтер С. Геральдіка: іллюстрірованная энціклопедія / С. Слейтер. – Москва: Эксмо, 2005. – 264 с.


## Лекцыя 6. Гістарычная храналогія ў навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы.

Ключавыя паняцці: храналогія, пачатак года, сусветны каляндар.

План:

1. Храналогія як навука
2. Юліянскі, грыгарыянскі і новаюліянскі календары.
3. Французскі рэвалюцыйны каляндар.
4. Спробы стварэння сусветнага календара.

1. Слова “*храналогія*” паходзіць ад двух грэчаскіх слоў: “хронас” – “час” і “логас” – “вучэнне”. Храналогія як навука складаецца з двух частак: матэматычнай або астранамічнай храналогіі і гістарычнай храналогіі.

Гістарычная храналогія з’яўляецца адной з самых значных дапаможных гістарычных дысцыплін – яна адлюстроўвае найбольш значны параметр

гісторыі – гістарычны час.

2. Юліянскі календар звязаны з рэформай календара, якая была праведзена ў 46 г. да н.э. па ініцыятыве Юлія Цэзара і пры ўдзелу александрыйскага астранома Сазігена. Сутнасць рэформы заключалася ў тым, што Сазіген прапанаваў лічыць год роўным 365,25 суткам (а не 365,2422, як на самой справе), акругліўшы дзесятковы дроб і тым самым крышачку павялічыўшы календарны год у параўнанні з сонечным. Да чацвёртага года дадаваўся дзень. Гэты год быў роўны ўжо не 365, а 366 дням і атрымаў назву *вісакоснага*. З прычыны таго, што па юліянскім календары год был некалькі больш за астранамічны, ён стаў адставаць ад астранамічнага года на 1 суткі ў 128 гадоў. Гэтая розніца ў сутках паступова павялічвалася і дасягнула ў апошняй чвэрці XVI ст. 10 сутак. Спецыяльнай камісіі, якая была створана па ініцыятыве рымскага папы Грыгорыя XIII, было даручана правядзенне рэформы, сутнасць якой зводзілася да наступнага. Каб наблізіць каляндарны год да сонечнага, было прапанавана скараціць колькасць вісакосных гадоў. Прычым гэта датычылася толькі тых гадоў, якімі заканчвалася стагоддзе. 100 падзяляецца на 4, таму ўсе гэтыя гады былі вісакоснымі. Камісіяй было прапанавана, каб вісакоснымі лічыліся толькі тыя гады, першыя дзве лічбы якіх дзеляцца на 4. Гэтыя змяненні набліжалі каляндарны год да сонечнага, таму што ў юліанскім календары розніца ў адні суткі нарастае раз у 128 гадоў, а ў грыгарыянскім – розніца ў адні суткі нарастае раз у 3,5 тысячы гадоў. Яшчэ адной задачай рэформы была ліквідацыя розніцы якая атрымалася за шэраг тысячагоддзяў. У той момант яна састаўляла 10 сутак. Таму 1582 было вырашана скараціць на гэтую колькасць сутак. Спецыяльнай булай (загадам), выданай папам Грыгорыям XIII прадпісвалася ўсім каталікам лічыць пасля 4 кастрычніка 1582 г. не 5 кастрычніка, а 15. Такім чынам быў здейснены пераход на новы стыль. Каляндар атрымаў назву “грыгарыянскага”.

Розніца паміж юліянскім і грыгарыянскім календарамі ў XVI ст. складала 10 сутак, у XVII ст. яна не павялічылася (1600 быў вісакосным як у юліянскім, так і ў грыгарыянскім календары), у XVIII ст. яна павялічылася да 11 сутак (1700 вісакосны ў юліянскім і просты ў грыгарыянскім). У XIX ст. розніца была роўнай 12 суткам. А ў XX ст., пасля 1900 г. яна дасягнула 13 сутак. Такая розніца захаваецца да XXII ст.

Пасля ўвядзення ў СССР грыгарыянскага каляндара, юліянскі захаваўся толькі ў балканскіх краінах: Грэцыі, Югаславіі, Балгарыі, Румыніі. Аднак пытанне аб рэформе каляндара паўстала і гэтых краінах. У маі 1923 г. канстантынопальскім патрыярхам Мяленціям IV было прынята рашэнне аб змяненні каляндара па сістэме, прапанаванай югаслаўскім астраномам Міланковічам. Сутнасць рэформы была тая ж – скарачэнне колькасці вісакосных гадоў. Аднак скарачэнне адбывалася не толькі за кошт гадоў, якія канчаюць стагоддзе. Міланковіч прапанаваў выключаць 7 дзён з перыяду ў 900

гадоў. З дзевяці гадоў, якімі канчаюцца стагоддзі ў гэты перыяд, вісакоснымі лічацца толькі тыя гады, лічба сотняў у якіх падзяляецца на дзевяць з астаткам у 2 ці ў 6. такіх гадоў за 900-летні перыяд атрымліваецца толькі два. Усе астатнія гады па сістэме Міланковіча лічацца прастымі.

3. Французскі рэвалюцыйны каляндар абавязаны сваім паходжаннем французскім палітыкам. Новы каляндар быў распрацаваны групай вучоных на чале з Жыльберам Ромам і пасля выпраўленняў, зробленых Канвентам, ўведзены 5 кастрычніка 1793 г. Год складаўся з 365 дзён, падзяляўся на 12 месяцаў па 30 дзён, акрамя таго, для зраўноўвання з сонечным годам, у канцы дадавалася 5 ці 6 дзён, якія ў гонар паўстаўшага народа насілі назву "санкюлатыдаў", а пазней – "эпагаменаў" і былі выхаднымі. Святочнымі лічыліся таксама першы дзень першага месяца, 10, 20 і 30-ы дзень кожнага месяца. Кожны з дадатковых дзён быў прысвечаны, адпаведна, асабліваму святу: першы – святу Генія (чалавечага розума), калі ўшаноўваліся зробленыя вынаходніцтвы, другі – Працы, калі ўшаноўваліся героі працы. Далей ішоў дзень Подзвіга у дзень Узнагарод і атрымлівалі ўсе тыя, хто ўшаноўваўся ў папярэднія дні. У дзень Мненія адбывалася крытыка службовых асоб. Шосты дзень, які адбываўся раз у чатыры гады, быў прысвечаны спорту. Год пачынаўся 22 верасня – даты абвяшчэння рэспублікі. Месяцы атрымалі новыя назвы, звязаныя з асаблівасцямі клімата Францыі. Французскі рэвалюцыйны каляндар уводзіўся двойчы: першы раз ён праіснаваў каля 14 гадоў і быў адменены дэкрэтам Напалеона ад 21 фрюкцідора XIII года (9 верасня 1805 г.) і з 1 студзеня 1806 г. Францыя звярнулася да грыгарыянскага каляндара. Другі раз гэты каляндар быў уведзены ў 1871 г. Ён праіснаваў 72 дні і быў зноў заменены грыгарыянскім каляндаром пасля падзення Парыжскай камуны.

4. Існуючы ў наш час грыгарыянскі каляндар перастаў задавальняць патрэбы грамадства яшчэ ў XIX ст. Асноўныя недахопы, якія знаходзяць у грыгарыянскім каляндары гэта: неаднолькавая колькасць дзён у месяцах і працоўных дзён, якіх у месяцы можа змяшчацца ад 23 да 27 і неаднолькавая колькасць дзён у кварталах і паўгоддзях. Квартал можа змяшчаць ад 90 да 92 дзён. Першае паўгоддзе атрымліваецца карацейшым за другое на 2 або 3 дні. У 1923 г. пры Лізе нацый быў створаны "Падрыхтоўчы камітэт па спрошчанаму каляндару", у які паступіла больш за 200 прапаноў па спрашчэнні каляндара. Тэрміны ўвядзення новага каляндара назначаліся ў 30-я гады XX ст., але з-за пачатку Другой сусветнай вайны пытанне засталося невырашаным. Праекты сусветных каляндароў можна падзяліць на дзве асноўныя групы: каляндар з 13 месяцаў і каляндар з 12 месяцаў.

<u>Пытанні па матэрыялу лекцыі:</u>

1. Якія рысы з'яўляюцца адметнымі для храналогіі?

2. Па якой прыкмеце адрозніваюцца юліянскі, грыгарыянскі і новаюліянскі календары?

3. Назавіце асноўныя адрозненні юліянскага календара і календара французскай рэвалюцыі?

4. Чым адрозніваюцца праекты сусветнага календара з 12 і 13 месяцаў?

Літаратура:


1. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.
2. Леонтьева Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины / Г.А. Леонтьева, П.А. Шорин, В.Б. Кобрин. – 2-е изд., исправленное и дополненное. – Москва: Владос, 2015. – 380 с.


**Лекцыя 7. Пячаткі як гістарычныя крыніцы**

Ключавыя паняцці: сфрагістыка, сігілаграфія, легенда, матрыца, адбітак, выява, поле пячаткі, мастыка, прывесістыя, прыціскныя, прыклададальныя, курадымныя пячаткі.

План:

1. Сфрагістыка як навука.
2. Кароткі нарыс гісторыі пячатак.
3. Асноўныя тэрміны сфрагістыкі.
4. Віды пячатак

1. *Сфрагістыка* (ад грэчаскага Σφραγις – "пячатка") – дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае пячаткі, а таксама гісторыю іх узнікнення і існавання. Сфрагістыка можы мець іншую назву – ***сігілаграфія*** (ад лацінскага sigillum – пячатка + грэчаскае γραφο – пішу = "апісанне пячатак"). *Задачы сфрагістыкі* – апісанне і вывучэнне пячатак, а таксама ўстанаўленне сапраўднасці, прыналежнасці, дацiроўкі пячаткі як крыніцы па гісторыі існавання інстытутаў улады.

2. З пачатку свайго існавання і да нашых дзён пячатка адыгрывае адну і тую ж ролю – надае юрыдычную моц дакументу шляхам пасведчання яго сапраўднасці. Нягледзячы на нязменнасць прызначэння, з цягам часу пячатка мела розны знешні выгляд. На пачатку свайго існавання ў краінах Старажытнага Ўсходу пячатка мела выгляд цыліндра, які прыціскаўся да глінянай таблічкі, на якой заставаўся адбітак выявы ці надпісу пячаткі. Найбольш раннія знойдзеныя пячаткі датуюцца 7 тыс. да н.э. Зусім іншую форму мелі пячаткі антычнасці, якія мелі выгляд сыгнетаў – пярсцёнкаў-пячатак з выразанымі на шчытках выявамі, якія прыкладаліся да дакументу. Для ранняга сярэдневяковага перыяду, у асноўным, характэрны прывесістыя пячаткі, якія прывешваліся да дакумента і адбіваліся на мяккіх металах або мяккіх матэрыялах (воску і сургуче). З цягам часу прывесістыя пячаткі змяняюцца прыціскнымі.

3. Тэрмінам матрыца або штэмпель вызначаюцца ўласна пячаткі, якія

складаюцца з ***працоўнай паверхні*** і ручкі, якая часам аздаблялася і ў некаторых выпадках мела рыску для абазначэння верху выявы на пячатцы. Галоўнымі выявамі на працоўнай паверхні з'яўляліся ***выява*** і ***легенда***. ***Выява*** пячаткі прадстаўляе сабой малюнак, выразаны на працоўнай паверхні матрыцы. ***Легенда*** – гэта літарны надпіс, які служыць дадаткам да выявы і ў той жа час абумоўлены выкарыстаннем выявы, а таксама зацвярджае прыналежнасць пячаткі пэўнай асобе або ўстанове. Легенда і выява змяшчаюцца на ***поле пячаткі***, якое абмежавана паверхней працоўнай часткі матрыцы калі гаворка ідзе пра матрыцу або паверхней адбітка, калі разглядаецца адбітак. ***Кустодзея*** (ад лацінскага custos – "ахоўнік", "вартаўнік") сваёй назвай абавязана.

4. Пячаткі падзяляюцца на дзве групы: ***матрыцы*** і ***адбіткі***. ***Матрыцы*** - гэта ўласна пячаткі. ***Адбіткі*** – сляды пакінутыя матрыцай на пэўным матэрыяле (мяккім метале, воску, масцке, сургучу, паперы). Матэрыял адбіткаў і спосаб прымацавання да дакументаў ляжаць у аснове дзялення адбіткаў на ***прывесістыя*** і ***прыціскныя***. Да XV ст. часцей выкарыстоўваліся прывесістыя пячаткі. Прыкладныя адбіткі выціскаліся пярсцёнкамі. Далей усё часцей сталі выкарыстоўваюцца прыціскныя пячаткі. Некаторы час (на рубяжы XVIII-XIX стст.) выкарыстоўваліся ***прыкладальныя*** пячаткі, для якіх характэрна моцнае прыціcканне да паперы без ўжывання дапаможных матэрыялаў. ***Прыціскныя*** пячаткі падзяляюцца на васковыя, воска-масцікавыя, сургучныя і куродымныя. Васковыя пячаткі бываюць з чыстага воску (белыя або жоўтыя) або з дамешкамі фарбы (чырвонай, цёмна-карычневай, чорнай). ***Васковыя*** пячаткі ўжываліся з XIV па XVII ст. Часам у дакументах сустракаецца спасылка на колер пячаткі, які мог быць чорным, чырвоным або натуральнага колеру. Нетрываласць васковых пячатак абумовіла выкарыстанне ***воска-мастцічных*** пячатак. Масціка прадстаўляла сабой воск, змешаны з фарбай, часцей за ўсё, чырвонай, мукой, смалой, крэйдай, тлушчам. ***Сургучныя*** пячаткі з'явіліся ў канцы XVII ст. Мучна-крухмальныя адбіткі існуюць паралельна воска- масцічным. У XVII ст. і да 30-х гадоў XVIII ст. сустракаюцца хлебныя адбіткі, зробленыя з мякішу хлеба або з цеста. ***Куродымныя*** адбіткі характэрныя для ніжэйшых дзяржаўных устаноў у XVIII-XIX стст. Матэрыялам для такіх адбіткаў служыла сажа.

Пытанні па матэрыялу лекцыі:

1. Якія рысы характарызуюць сфрагістыку?
2. Ці можна па знешнім выглядзе вызначыць час стварэння пячаткі?
3. Што такое легенда, матрыца, адбітак, выява, поле пячаткі? Які матэрыял выкарыстоўваўся для вытворчасці матрыц і адбіткаў?

Літаратура:

1. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009.

– 139 с.
2. Леонтьева Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины / Г.А. Леонтьева, П.А. Шорин, В.Б. Кобрин. – 2-е изд., исправленное и дополненное. – Москва: Владос, 2015. – 380 с.

**Лекцыя 8. Меры даўжыні, плошчы, вагі і аб'ёма ў гістарычных крыніцах ад старажытных часоў да XX ст.**

**Ключавыя паняцці: метралогія; меры вагі, даўжыні, плошча, аб'ема, антрапаметрычныя меры.**

План:

1. Метралогія як навука.
2. Задачы і крыніцы метралогіі.
3. Практычная метралогія.

*Метралогія* – (ад грэч. метрон – мера і логос – навука) гэта дысцыпліна, якая мае два напрамкі: адзін з іх – стварэнне канкрэтных адзінак вымярэння – эталонаў. Другі, *гістарычная метралогія* – дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая займаецца вывучэннем узнікнення і развіцця розных мер: даўжыні, плошчы, вагі і аб'ёма, іх суадносіны, а таксама ўтварэнне, ужыванне і змяненне з цягам часу сістэм вымярэння ў гаспадарцы розных народаў. Метралогія вырашае наступныя *задачы*: вывучэнне назваў мер, гісторыю іх узнікнення і развіцця, гісторыю ўзнікнення і існавання розных сістэм вымярэнняў, іх адпаведнасць сучасным мерам. *Крыніцамі вывучэння метралогіі* з'яўляюцца пісьмовыя помнікі: летапісы, граматаы, юрыдычныя дакументы, перакладныя кнігі, дзе ўзгадваюцца меры. Метралогія цесна звязана з *палеаграфіяй, археалогіяй, эпіграфікай, мовазнаўствам*. *Практычная метралогія* ўзнікла яшчэ ў старажытным грамадстве. Першымі адзінкамі вымярэння былі так званыя меры *антрапаметрычнага* характару - часткі чалавечага цела або адлегласць паміж імі: локаць, ступня, крок, сажань. У аснову шмат якіх адзінак вымярэння пакладзены прылады працы ці колькасць прадукта. Некаторыя адзінкі вымярэння спачатку былі агульнымі як меры вагі і грашовыя адзінкі. Развіццё феадальных адносін, цэнтралізацыя дзяржавы прыводзілі да уніфікацыі мер, стварэння агульнадзяржаўнай сістэмы вымярэнняў. Меры афіцыйна зацвярджаліся, ствараліся кнігі даведачнага характару, эталоны вымярэнняў. Як дапаможная гістарычная дысцыпліна метралогія пачала афармляцца з XIX ст. Звесткі пра старажытнарускія меры выкарыстоўваліся Н. Карамзіным для "Истории государства Российского». Апісальны характар мела кніга Ф. Пятрушэўскага "Общая метрология». Сярод прац па метралогіі трэба адзначыць "Древнюю русскую метрологию» Дз. Празароўскага, "Древнерусскую метрологию» С. Кузняцова. Старажытнарускія меры аналізіравалі Н. Бяляеў, Б. Балсуноўскі, П. Буткоў, І. Каўфман. Звесткі аб мерах, якія выкарыстоўваліся ў старажытнасці на тэрыторыі Беларусі ёсць у А. Семянтоўскага, С. Гальдштэйна, слоўніку Н.

Гарбачэўскага. Старажытныя меры вывучалі А. Чарапнін, Б. Рыбакоў, В. Янін. Абагульненне назапашанага матэрыяла зроблена ў працах А. Каменцавай, П. Шорына. Багаты ілюстратыўны матэрыял ёсць ў працах мовазнаўцаў, якія вывучаюць назвы старажытных адзінак вымярэння. Гэтаму прысвечаны артыкулы З. Даўнене, А. Юрэвіча, А. Яновіча, манаграфіі Л. Шакуна, К. Скурата.

Пытанні па матэрыялу лекцыі:

1. Што характарызуе метралогію як навуку?
2. Назавіце асноўныя задачы і крыніцы метралогіі?
3. Якія этапы прайшла метралогія як навука?

Літаратура:

1. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.

Леонтьева Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины Г.А. Леонтьева, П.А. Шорин, В.Б. Кобрин. – 2-е изд., исправленное дополненное. – Москва: Владос, 2015. – 380 с.

**Лекцыя 9. Манеты як гістарычныя крыніцы**

Ключавыя паняцці: нумізматыка, аверс, рэверс, гурт, стапа, монаметалізм, біметалізм, проба,

План:

1. Нумізматыка як навука.
2. Сувязь нумізматыкі з іншымі навукамі.
3. Гісторыя развіцця нумізматыкі.
4. Тэарэтычная нумізматыка. Асноўныя паняцці і тэрміны.

1. Пачатак грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі.1. *Нумізматыка* (ад лацінскага nomisma – “манета”) – гэта навука, якая вывучае паходжанне манет, гісторыю ўзнікнення і развіцця грашова-вагавых сістэм, грашовага абарачэння і манетнай вытворчасці. *Прадметам* вывучэння нумізматыкі з’яўляюцца манеты. *Аб’ектам* даследавання – сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і якія можна даследаваць з дапамогай манет. Так, па знаходках манетных скарбаў, у асноўным, у далінах рэк мы можам вызначыць і ўдакладніць гандлёвыя шляхі, якія існавалі ў той час. Па вазе манет, удзельнай вазе ў іх высакародных і невысакародных металаў можна зрабіць выснову пра ступень развіцця эканомікі ў краіне.

2. Нумізматыка мае сувязь з *археалогіяй*. Пры правядзенні археалагічнага даследавання манеты, знойдзеныя ў культурным слаі, дапамагаюць яго дацыроўцы. Нумізматыка звязана з *геральдыкай*. На манетах часта сустракаюцца выявы гербаў, якія дапамагаюць вызначыць прыналежнасць грошаў той ці іншай краіне. Таксама нумізматыка мае сувяць з

*эпіграфікай* у плане чытання надпісаў на манетах. Пры вывучэнні нумізматыкі трэба мець хаця б пачатковыя веды з вобласці *хіміі*. Нумізматыка мае адгалінаванне – *баністыку*, навуку, якая вывучае папяровыя грошы і каштоўныя паперы.

3. Напачатку вывучэння нумізматыкі можна вылучыць хутчэй колькасныя працэсы, якія адлюстроўваліся ў збіранні і калекцыяніраванні манет. Працэс афармлення найбольш буйных манетных калекцый пачаўся ў XV ст. у Заходней Еўропе і інтэнсіўна праходзіў у XVIII ст. у Вене, Парыжы, Лондане, Пецярбургу, Берліне. На тэрыторыі Беларусі вялікія манетныя калекцыі былі сабраны ў першай палове XIX ст. у г. Гомеле М. Румянцавым (20-я гады XIX ст.) і І. Паскевічам (30-я гады XIX ст.). У прыватнасці, калекцыя, сабраная М. Румянцавым і перавезеная ў 1861 г. у Маскву, была пакладзена ў аснову нумізматычнага збора Румянцаўскага музея. Калекцыя Я. Тышкевіча, сабраная ім у 40-60 гг. У Віленскай губерні стала асновай нумізматычнага збору Віленскага музея старажытнасцяў. Сярод выдатных вучоных-калекцыянераў XIX ст. можна назваць таксама Г. Татура, М. Кусцінскага, Я. Раманава. З цягам часу працэс калекцыяніравання пераўтварыўся ў працэс апісання і вывучэння шляхам аналізу і класіфікацыі. Да вывучэння нумізматычных даных прыцягваліся даныя іншых навук. Таксама назіраўся працэс перадачы прыватных калекцый музеям, у тым ліку, тым, якія былі створаны пры статыстычных камітэтах Віленскай, Гродзенскай, Віцебскай, Магілеўскай і Мінскай губерняў. Сярод музеяў, якія мелі вялікія нумізматычныя калекцыі – музей В.П. Федаровіча (з 1880 г.), Царкоўна-археалагічны музей (з 1893 г.), Аддзяленне Маскоўскага археалагічнага музея ў Віцебску (з 1911 г.), Царкоўны гісторыка-археалагічны музей (з 1907 г.), Музей таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі ў Мінску (з 1912 г.). Пасля рэвалюцыі, з 1922 г. нумізматычныя калекцыі захоўваліся таксама ў Беларускім дзяржаўным музеі ў Мінску і іншых музеях. У гады Вялікай айчыннай вайны калекцыі падвергліся знішчэнню. Пасля вайны калекцыі музеяў папаўняюцца за кошт знойдзеных у скарбах і падчас археалагічных даследаванняў манет. Сярод вялікіх калекцый можна вызначыць калекцыю Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, а таксама нумізматычны музей БДУ.

Як дысцыпліна нумізматыка пачала афармляцца ў першай палове XVIII ст. хаця першыя аматарскія даведнікі па нумізматыцы выходзілі раней. Першапачаткова вывучэнне скарбаў мела прыкладны характар. Вывучаліся вага, памеры, выявы, легенды на манетах, рабілася іх класіфікацыя. Са скарбаў адбіраліся самыя каштоўныя манеты, астатнія ішлі на пераплаўку. Пастутова да даследчыкаў прыйшло разуменне, што скарб як адзінка з'яўляецца больш каштоўным для навукі, чым уся сукупнасць манет у ім. Гэта атрымліваецца таму, што комплекс манет у скарбе можна разглядаць як адлюстраванне

сучаснай скарбу сістэмы грашовага абарачэння.

Што датычыцца навуковых работ па нумізматыцы Беларусі, то іх спачатку было няшмат. Сярод іх можна назваць артыкулы П. Харламповіча, выдадзеныя ў 1927 г. і рукапісы М. Шчакаціхіна. На сённяшні момант найбольш поўным адлюстраваннем праблемы нумізматыкі Беларусі з’яўляюцца кнігі і артыкулы В. Рабцэвіча. Шмат інфармацыі змешчана ў “Энцыклапедыі археалогіі і нумізматыкі Беларусі”.

4. Як і любая іншая навука нумізматыка мае шэраг спецыяльных тэрмінаў, без якіх немагчыма ўяўленне і вывучэнне прадмета. У нумізматыцы яны звязаны з прадметам вывучэння – манетамі. Назва “манета” паходзіць з лацінскай мовы ад аднаго з эпітэтаў рымскай багіні Юноны і азначае “дарадчыца, наладжвальніца”. Згодна легендзе, ад Юноны атрымалі рымляне грошы і перамогу ў вайне з Пірам у 275 г. да н.э. Першы манетны двор у Старажытным Рыме знаходзіўся менавіта пры храме Юноны. *Манета* – металічны знак, часцей дыскападобнай формы, на абодва бакі якога нанесены клеймы ў выглядзе выяў і легенд (надпісаў), якія выступаюць у ролі знакаў якасці, гарантуемых імітэнтам (правіцелем) або дзяржавай. Манеты маюць дзве асноўныя групы прыкмет: *матэрыяльную* і *знешнюю*. Кожная манета мае два бакі. Гэтая паверхня мае назву *поле* манеты. Адзін з бакоў – ліцавы або *аверс* (avers скарочана av. або л.б.), той, на якім ёсць выява або легенда, якая вызначае дзяржаўную прыналежнасць манеты і адваротны або *рэверс* (revers, скарочана rev. або адв. б.). Бакавая рабрына манеты завецца *гуртам*. Надпіс на манеце мае назву *легенда*. Легенда бывае чатырох разнавіднасцяў: *радковая* (надпіс у радок), *кругавая* (ўздоўж краю поля манеты), *камбінаваная* (радковая і кругавая) і *гуртавая* (па гурце манеты). У легендзе шырока выкарыстоўваюцца скарачэнні – *абрэвіатуры*. За кошт гэтага на адносна невялікім па памерах полі размяшчаюцца доўгія словы. Абрэвіатуры выкарыстоўюцца для абазначэння цэнтраў манетных эмісій, а таксама ініцыялаў ліц, якія кіравалі чаканкай манет. Таксама на легендах выкарыстоўваюцца лічбы. Дата выпуска манет у Рэчы Паспалітай рэгулярна пачала абазначацца з XVI ст. Яна пісалася часам лічбамі, часам лацінскімі літарамі. У Расіі з 1699 па 1722 г. для даціроўкі манет выкарыстоўваліся літары славянскага алфавіта. У арабскіх краінах даціроўка манет даецца па хіджры. Метал, вага, манетная стапа, проба – матэрыяльныя прыкметы манет. Асноўнымі *металамі*, якія бяруцца для вытворчасці манет, з’яўляюцца серабро, золата, іх натуральная змесь – электр, білон (серабро нізкай пробы), плаціна, медзь, нікель, жалеза, свінец, волава, алюміній, розныя сплавы. Часта высакародныя металы маюць *лігатуру*, гэта значыць, дамешак невысакародных металаў. Яна ўводзіцца ў састаў манеты з мэтай надання сплаву большай цвёрдасці, або з мэтай патанення. *Манетная стапа* – строга азначаная колькасць манет, якая павінна быць зроблена з азначанай вагавай

колькасці метала. *Проба* – працэнтныя суадносіны паміж колькасцю каштоўнага метала і лігатуры ў манеце. Тэрмін проба (ад лацінскага probo – “правяраю, ацэньваю) выкарыстоўваецца пры чаканцы манет з каштоўных металаў: золата, серабра, плаціны і адлюстроўвае змест каштоўнага метала ў сплаве, з якога зроблена рэч. Існуюць чатыры сістэмы проб: *метрычная, каратавая, залатніковая* і *лотавая*. *Намінал* – абазначэнне дастоінства на манетах і папяровых грошах. Спачатку наміналы атрымлівалі сваю назву ад вагавых адзінак, якім яны адпавядалі, потым вага манеты мянялася, а назва заставалася.

Пытанні па матэрыялу лекцыі:

1. Што характарызуе нумізматыку як навуку?
2. З якімі навукамі звязана нумізматыка?
3. Якія этапы прайшла нумізматыка?
4. Назавіце асноўныя паняцці і тэрміны нумізматыкі?

Літаратура:


1. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.
2. Сідаровіч В.М. Гісторыя вывучэння антычных манет у Беларусі / В.М. Сідаровіч // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. – Вып. 11. – Мінск: БДУ, 2016. – С. 176–186.

## ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### Планы семінарскіх і практычных заняткаў

**ТЭМА 1. Роля дапаможных гістарычных дысцыплін у вывучэнні гістарычнай крыніцы.**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен ведаць розніцу паміж знешняй і ўнутранай крытыкай крыніц, вызначаць ступень правамернаці выкарыстання гістарычнай крыніцы ў даследаваннях.

1.Знешняя і ўнутраная крытыка крыніц.

2.Аналіз тэксту, уласных імёнаў, геаграфічных звестак, і інш. з дапамогай дапаможных гістарычных дысцыплін.

3.Вызначэнне ступені правамернасці выкарыстання крыніцы ў навуковым даследаванні.

Літаратура

1. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна- метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.

**ТЭМА 2. Палеаграфія і яе значэнне для вывучэння гістарычнай крыніцы.**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен умець выкарыстоўваць палеаграфічны аналіз для даследавання навуковай крыніцы.

1.Выкарыстанне даных палеаграфіі ў навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы.

2.Паходжанне славянскай пісьменнасці.

3.Выкарыстанне палеаграфічных матэрыялаў у працы настаўніка гісторыі.

Літаратура

1. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна- метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.

**ТЭМА 3. Графічныя тыпы кірылічнага пісьма ў гістарычных крыніцах**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен ведаць прычыны змянення графікі пісьма, матэрыял і прылады для пісьма, графічныя тыпы кірылічнага пісьма, упрыгожванні рукапісаў і віды арнаментаў.

1. Прычыны змянення графікі пісьма.

2.Матэрыял і прылады для пісьма.

3. Вязь як від дэкаратыўнага пісьма.

4.Упрыгожванні рукапісаў і іх значэнне для крытыкі гістарычнай крыніцы.

5.Віды арнаментаў.

Літаратура

1. Калечиц И.Л. Практикум по вспомогательным историческим дисциплинам: палеография, геральдика, хронология, ономастика пособие / И.Л. Калечиц. – Минск: БГПУ, 2012. – 156 с.
2. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.

**ТЭМА 4. Гістарычныя крыніцы, напісаныя ўставам: характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен ведаць старажытнарускі алфавіт, абазначэнне лічбаў літарамі, умець рашаць крыптаграфічныя задачы на аснове ведання лічбаў, а таксама павінен ведаць асноўныя прыметы ўстаўнога пісьма і авалодаць чытаннем тэкстаў, напісаных уставам.

1. Літарны дыктант, лічбавы дыктант. Лічбавая крыптаграфія – запіс імёнаў.
2. Чытанне тэкстаў, адаптаваных для першапачатковага знаёмства сучасным друкаваным шрыфтам.
3. Характэрныя прыметы ўстава.
4. Чытанне тэкстаў, напісаных уставам.
5. <u>Літаратура</u>

3. Калечиц И.Л. Практикум по вспомогательным историческим дисциплинам: палеография, геральдика, хронология, ономастика пособие / И.Л. Калечиц. – Минск: БГПУ, 2012. – 156 с.
4. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.

**ТЭМА 5. Гістарычныя крыніцы, напісаныя паўуставам: характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне**

Чытанне тэкстаў, напісаных паўуставам. Кожны студэнт павінен ведаць асаблівасці напісання тэкстаў паўуставам і авалодаць чытаннем тэкстаў, напісаных паўуставам.

1. Характэрныя прыметы паўустава.
2. Чытанне тэкстаў, напісаных паўуставам.
3. Прыметы тэкстаў, характэрныя для летапісаў, грамат, царкоўных кніг.

<u>Літаратура</u>

1. Калечиц И.Л. Практикум по вспомогательным историческим дисциплинам: палеография, геральдика, хронология, ономастика : пособие / И.Л. Калечиц. – Минск: БГПУ, 2012. – 156 с.
2. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна- метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.

**ТЭМА 6. Гістарычныя крыніцы, напісаныя скарапісам: характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне**

Чытанне тэкстаў, напісаных скарапісам. Кожны студэнт павінен ведаць асаблівасці напісання тэкстаў скарапісам і авалодаць чытаннем тэкстаў, напісаных скарапісам, а таксама асноўныя прыёмы напісання вязі і чытання загалоўкаў, напісаных вяззю.

1. Характэрныя прыметы скарапісу.

2. Чытанне практыкаванняў на распазнаванне скарапісу.
3. Чытанне тэкстаў, напісаных скарапісам.
4. Характэрныя прыметы вязі.
5. Чытанне загалоўкаў, напісаных вяззю.

Літаратура

1. Калечиц И.Л. Практикум по вспомогательным историческим дисциплинам: палеография, геральдика, хронология, ономастика : пособие / И.Л. Калечиц. – Минск: БГПУ, 2012. – 156 с.
2. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна- метадычны

**ТЭМА 7. Гарадскія гербы на тэрыторыі Беларусі ў гістарычнай рэтраспектыве.**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен ведаць асноўныя геральдычныя тэрміны і ўмець блазаніраваць гербы.

1. Асноўныя геральдычныя тэрміны.
2. Галоўнае правіла геральдыкі.
3. Блазаніраванне гербоў.
4. Уласныя гербы на філігранях.

Літаратура

2. Калечиц И.Л. Практикум по вспомогательным историческим дисциплинам: палеография, геральдика, хронология, ономастика : пособие / И.Л. Калечиц. – Минск: БГПУ, 2012. – 156 с.
3. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна- метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.

**ТЭМА 8. Гарадскія гербы Рэспублікі Беларусь як гістарычныя крыніцы: блазаніраванне і выкарыстанне даных.**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен беспамылкова блазаніраваць гарадскія гербы Рэспублікі Беларусь.

1. Практычная геральдыка.
2. Маляванне і блазаніраванне ўласных гербоў.
3. Блазаніраванне гарадскіх гербоў.
4. Напісанне тэстаў па геральдыцы.

Літаратура

1. Калечиц И.Л. Практикум по вспомогательным историческим дисциплинам: палеография, геральдика, хронология, ономастика : пособие / И.Л. Калечиц. – Минск: БГПУ, 2012. – 156 с.
2. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна- метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.

**ТЭМА 9. Асноўныя тэрміны гістарычнай храналогіі: час і яго вымярэнне.**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры студэнт павінен ведаць

адзінкі вымярэння часу.

1. Паняцце сутак, тыдня, месяца, года.
2. Старажытныя каляндары і прынцыпы іх пабудовы.
3. Паняцце эры і пачатку года.

Літаратура:

Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна- метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.
Каменцева, Е. И. Хронология / Е. И. Каменцева. – 2-е изд. испр. и доп. – М. : Аспент Пресс, 2003. – 108 с.

**ТЭМА 10. Вызначэнне дат гістарычных падзей у гістарычных крыніцах.**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен умець рашаць задачы па храналогіі на вылічэнне свята Пасхі і індыкту года, дня тыдня і пераходзячых святаў для дат, згаданых у летапісах і іншых крыніцах.

1. Вызначэнне вруцэлета.
2. Формулы для вызначэння дня Пасхі.
3. Вылічэнне Пасхі па табліцах.
4. Вылічэнне індыкту года.
5. Вылічэння дня тыдня па формуле.
6. Вызначэнне дат пераходзячых святаў.

Літаратура

1. Калечиц И.Л. Практикум по вспомогательным историческим дисциплинам: палеография, геральдика, хронология, ономастика : пособие / И.Л. Калечиц. – Минск: БГПУ, 2012. – 156 с.
2. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.

**Тэма 11. Пячаткі на тэрыторыі Беларусі: гісторыя існавання, матэрыял, мова, сфера выкарыстання.**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен умець вызначаць пячаткі азначаных перыядаў, пералічыць характэрныя рысы, даць прыблізную даціроўку.

1. Старажытнарускія пячаткі.
2. Пячаткі XI-XIII стст.
3. Пячаткі XIV-XVII стст.
4. Пячаткі XVIII ст.
5. Пячаткі пасля XVIII ст.

Літаратура:

1. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.

2. Леонтьева Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины / Г.А. Леонтьева, П.А. Шорин, В.Б. Кобрин. – 2-е изд., исправленное и дополненное. – Москва: Владос, 2015. – 380 с.

**ТЭМА 12. Даныя гістарычнай метралогіі ў гістарычных крыніцах**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен ведаць метралагічныя крыніцы і метады, якімі карыстаецца метралогія для іх вывучэння

1.Метады гістарычнай метралогіі ў навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы.

2.Метралагічныя крыніцы.

3.Практычнае выкарыстанне даных метралогіі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі.

Літаратура:

1. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.
2. Леонтьева Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины / Г.А. Леонтьева, П.А. Шорин, В.Б. Кобрин. – 2-е изд., исправленное и дополненное. – Москва: Владос, 2015. – 380 с.

**ТЭМА 13. Меры даўжыні, плошчы, вагі і аб'ёма ў гістарычных крыніцах ад старажытных часоў да XX ст.**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен ведаць умовы ўзнікнення метрычнай сістэмы мер, меры старажытнасці, сярэдневякоўя і новага часу і іх перавод на сучасную сістэму лічэння.

1. Старажытны перыяд метралогіі.
2. Меры XV-XVII ст.
3. Меры XVIII – пачатку XX ст.
4. Стварэнне метрычнай сістэмы вымярэнняў. Пераўтварэнне яе міжнародную сістэму мер і вагаў.

Літаратура:

3. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.
4. Леонтьева Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины / Г.А. Леонтьева, П.А. Шорин, В.Б. Кобрин. – 2-е изд., исправленное и дополненное. – Москва: Владос, 2015. – 380 с.

**ТЭМА 14. Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі са старажытных часоў да XX стст.**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен вызначаць па знешнім выглядзе манеты антычнасці, візантыйскія, заходнееўрапейскія і арабскія манеты.

1. Антычныя манеты.
2. Візантыйскія манеты.
3. Арабскія манеты.
4. Заходнееўрапейскія манеты. Літаратура

1. Калечиц И.Л. Практикум по вспомогательным историческим дисциплинам: палеография, геральдика, хронология, ономастика : пособие / И.Л. Калечиц. – Минск: БГПУ, 2012. – 156 с.
2. Калечыц І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мінск: БДПУ, 2009. – 139 с.

**ТЭМА 15. Тапонімы і антрапонімы ў гістарычных крыніцах**

На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен ведаць аб’ектыўныя гістарычныя прычыны ўзнікнення тапонімаў час іх узнікнення, каштоўнасць мікратапанімічнай спадчыны. На аснове вывучэння рэкамендаванай літаратуры кожны студэнт павінен ведаць аб’ектыўныя гістарычныя прычыны ўзнікнення антрапонімаў, час іх узнікнення.

1. Гістарычная анамастыка як дапаможная гістарычная дысцыпліна.
2. Антрапаніміка, тэаніміка, астраніміка, зааніміка, этнаніміка, тапаніміка, гідраніміка і г.д.
3. Дээтымалагізацыя ўласных імёнаў.
4. Даанамастычныя, анамастычныя і аданамастычныя назвы.
5. Гістарычная тапаніміка як раздзел анамастыкі.
6. Тапонімы.
7. Мікратапаніміка.
8. Гістарыяграфія тапанімічных даследаванняў.

1 .Існаванне тапонімаў: іх узнікненне, знікненне, адраджэнне. Тапонімы славянскага і балтскага паходжання.

10 .Прызнакі, якія пакладзены ў аснову тапонімаў: агульнагеаграфічныя, па тыпах пасялення, ад антрапонімаў, прамысловыя і транспартныя.

11 .Пласты тапанімічнай лексікі: прычыны іх узнікнення і час існавання.

12 .Гістарычная антрапаніміка як раздзел анамастыкі.

13 .Антрапонімы.

14 .Гістарыграфія даследавання антрапонімаў.

15.Імя, імя па бацьку, прозвішча.

16 .Хрысціянскія і паганскія імёны.

17.1 Імёны-мянушкі.

18 .Княжацкія імёны.

19 .Утварэнне жаночых імёнаў і прозвішчаў.

20 .Антрапонімы як аснова для ўтварэння тапонімаў.

Літаратура

1. Антрапанимика. М., 1970.

2. Бірыла В.М. Беларуская антрапаніміка. уласныя імёны, імёны–прозвішчы, імёны–мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы. Мінск,1996.

3. Бірыла М.В. Беларуская антрапаніміка. Уласныя імёны, імёны– мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы. Мінск, 1966.

4. Бірыла М.В., Лемцюгова В.П. Анамастычныя славаўтваральныя элементы ва ўсходне– і заходнеславянскіх мовах (адантрапанімічныя айконімы). Мінск, 1973

5. Тупиков Н.М. Словарь древнерусских личных собственных имён / Вступит. статья и подгот. текста В.М. Воробьёв. – М., 2004.

## РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

### <u>Тэст па палеаграфіі (узор)</u>

1. Закончыць сказ. “Прадметам вывучэння палеаграфіі з’яўляецца …
2. Закончыць сказ. “Тэраталагічны арнамент атрымаў сваю назву таму …
3. На тэрыторыі Беларусі напісаны (падкрэсліць): Астрамірава евангелле, Аршанскае евангелле, Полацкае Евангелле
4. Пералічыць характэрныя прызнакі устава
5. **Звод** гэта:

а) адхіленні ад стараславянскай арфаграфіі, якія адлюстроўваюць мясцовыя моўныя асаблівасці,
б) некалькі рукапісаў, аб’яднаных разам,
в) рукапісны дакумент, напісаны асобай графікай
г) копія іншага рукапіснага помніка.

6. Вызначыць тып тэксту і назваць яго характэрныя прызнакі, прыкладна вызначыць дату напісання.



7. Запісаць лічбы ў літарным выглядзе:
   7  10  94  2054  116
8. Якія з літар з’яўляюцца запазычаннямі з грэчаскага алфавіту Ж Д М Ò Ш П Ф **А** ¼ Щ

9. Якія з літар не абазначалі лічбаў:
   В  Ш  Б  D

10. Зрабіць расшыфроўку імя пісца А писал **КК.А.ІЧ.І І.ВГ.КІ.**



3. Зрабіць **шрафіроўку** наступнага колеру





1. **Геральдыка** – гэта …
5. Наступная геральдычная фігура мае назву:
2. Дадзеная шрафіроўцы



А) Пас Б) Чало В) Перавязь справа Г) Перавязь злева

6. Геральдычнымі фігурамі з’яўляюцца:

А) Гіпацэнтаўр, Б) Медуза, В) Кроква Г) Слуп

Натуральныя негеральдычныя фігуры гэта: А) жывёлы, расліны, зямныя і

Адпавядае: А) блакіт, Б) золата, В) серабро

нябесныя целы

Б) зробленыя у выніку працы чалавека: прылады працы, зброя, будынкі і г.д.

В) розныя пачвары, міфічныя і фантастычныя жывёлы.

7. **Бурэлет** – гэта

А) месца з’яднання шлема і намёта

Б) тканіна ў выглядзе лісця аканта

В) сімвал вярхоўнай улады

Г) выява на шчыце

8. Гарадскія гербы тыпу “**турыстычнага значка”** існавалі ў

А) 20-я гады XX ст., Б) 60-я гады XX ст. В) 60-я гады XIX ст.

9. Адраджэнне гербавай сімволікі Беларусі пачалося …

**Заданні па храналогіі (узор)**

Знайсці год

1

В ле6т ¤s777ф7п7г7 почата бы6с церкы Печерьская над основаньем Стефаномъ игуменомь и кончана бы6с на третье лето мц6а июля а7i7 днь. В се же ле6т придоша сли изъ немець к Ст6ославу.

2

В ле6т ¤s777ф7п7е7 поиде Изяславъ с ляхы. Седе Борисъ Чернигове мц6а мая д7 дн6ь и быс6ть княженья его и7 дн6ии и бежа Тмутороканю к Романови.

3

В ле6т ¤s777ф7п7s7 беже Олегъ сн6ъ Сто6славъ Тмутороконю от Всеволода мц6а априля i7. В се же ле6т ѝбиенъ бысть Глебъ сн6ъ Ст6ославль.

4

В ле6т ¤s777х7в7 придоша прузи на Русьскую землю мц6а авгус6 въ к7s7 и поедоша всяку траву и многа жита.6

5

В ле6т ¤s777х7i7 бысть знаменье на небеси мц6а генваря въ к7³7 дн6ь по г7 днии акы пожарная заря от востока и Ега и запада и севера и бысть тако свет всю нощь акы от луны полны светящася. В то же ле6т бысть знаменье в луне мц6а февраля въ е7 днь того мца въ з7 дн6ь.

6

В ле6т ¤s777х7г7i7 постави митрополит еп6па Анфилофия Володимерю мц6а августа въ к7з7 днь. Томъ лете постави ЛазаряПереяславле ноября въ в7i7 то же лето постави Мину Полотьску декабря въ г7i7 днь.

7

В ле6т ¤s777ф7о7з7 седе Изяславъ на столе своем.

<u>Заданні на вызначэнне індыкта</u>

1

В ле6т ¤s777х7л7г7 индикта еі днь наченьшу Михаилу царствовати начаша ся прозывати Руска земля

2

Писано было при Святославе велицем князе Рустемъ мц6а июля индикта въ д7і7. В лето ¤ S777µ7о7³7.

Се же бысть исходящю лету ¤s777х7д7 индикта д7 на полы.

4

В ле6т ¤s777х7е7і7 индикта кругъ луны д7 летъ а слн7чнаго и летъ.

5

Игуменъ Селивестръ написа книгы си Летописець в ¤s777х7к7д7 индикта ³7 летъ.7

6

В ле6т ¤s777х7л7г7 индикта третьего ле6т преставися благоверныи и велики князь Русскыи Володимеръ сн6ъ благоверна отца Всеволода.

<u>Вызначэнне святаў ад Пасхі</u>

1

Мц6а се6н в7 нед6ли и7 в ле6т создания мира ¤S777µ7к7 Рµсь с грекы мир сотворили.

В лето ¤s777ф7п7к7 въ в7ю субботу по Пасце в ча6с в7 дне предаст игuмен Феодосии дш6ю свою в руце Бж7ии мц6а мая въ г7 дн6ь индикта въ а7і7 лето.

3

В ле6т ¤s777ф7§в7 приходи Ярополк ко Всеволоду на Великъ дн6ь в се же время выбегоста Ростиславича в7 и пришедшее прогнаста Ярополка.

В ле6т ¤s777ф7§³7 положили мощи Феодосья приспевшю празднику Успенья Бц6е треми дньми.

5

В ле6т ¤s777х7 мнози человецы uмираху различными недугы от Филиппова дне до мясопуста з7 тысячь.

6

В ле6т ¤s777х7г7 въ неделю сыропустную въ час а7 дне мц6а февраля въ к7д7 день Святополкъ же и Володимеръ посласта к Ольгови веляста ему поити на Половци с собою.

7

В ле6т ¤s777х7л7а7 преставися Селивестръ епп6ъ блаженыи мц6а априля въ в7і7 дн6ь в великыи четверг.
В то же ле6т падеся цр6кы каменная Переяславли ст6аго Михаила въ і7 дн6ь маия мц6а в суботу перед вечернею.

8

В ле6т ¤s777х7п7и7 преставися князь Мстиславъ сн6ъ Ростиславль внукъ Мстиславль в субботу н7 ю.

9

В ле6т ¤s777х7В7s7 мц6а марта в и7і7 дн6ь в сре7д вербное недели преставися Володимиръ Глебовичь Переяславли.

Вызначыць дзень тыдня

1

В ле6т ¤ S777фк7г7 Володимир скончася мц6а июля въ е7і7 день.

2

В ле6т ¤s777ф7…в7 пріідоша половці первое рускую землю воеваті. Всеволодъ же ізыде протіву імъ. Мц6а февраля въ в7 дн6ь.

3

В ле6т ¤s777фо7е7 Яраславичи поидоша к Немизе и Всеславъ поиде противу и совокупишася обои на Немизе мц6а марта въ г7 дн6ь.
Всеслав же бежа посемъ же мц6а иуля в і7 дн7ь.
Людие же высекоша Всеслава ис поруба въ е7і7 дн6ь семтября и прославиша.

4

В лето ¤s777ф7п7 пренесошася ст7ая страстотерпца Бориса и Глеба мц6а мая в7 дн6ь.

5

В ле6т ¤s777ф7п7а7 Ст7ославъ же и Всеволод внидоста в Кыевъ мц6а марта к7в7.

6

В ле6т ¤s777х7з7 убьенъ Стославъ сн6ъ Ст6ополчь в Володимери мц6а июня въ в7і7 дн6ь.

Вызначыць, ці дакладна названы дзень

1.

В ле6т s777ф7…в7 преставися великий князь Русьскыи Ярославъ в субботу а7 но ста6го Феодора.

2

В ле6т ¤s777ф7§³ 7 взяша мощи Феодосьевы и принесша положиша в притворе на десней стране мц6а августа въ д7і7 дн6ь в дн6нь четвертъкъ въ ча6съ а7 дне индикта д7і7 летъ.

3

В ле6т ¤s777х7а7 индикта а7 лето.преставися великыи князь Всеволод сн6ъ Ярославль внукъ Володимеръ м6а априля в г7і7 дн6ь а погребенъ бысть д7і7 день. Недели сущи тогда страстнеи в дни сущю четвертку.

4

В ле6т ¤s777х7а7 в день антипаскы мц6а априля въ к7д7 дн6ь приде Святополк Кыеву и изыдоша противу ему Кыяне с поклоном и прияша и с радостью.

В ле6т ¤s777х7а7половци взратишася къ Торцькому в дн6ь Възнсенья Га6 нашего Іс6а Ха6.

В ле6т ¤s777х7а7 половци взратишася къ Торцьскому быша же си злая м6ца иuля въ к7г7 назаутре еже в к7д7 въ стою мч6нику Бориса и Глеба бысть плач велик в граде а не радость.

6

В ле6т ¤s777 и х7д7 Олегъ же выбеже изъ Чернигова мц6а мая въ г7 дн6ь в субботу. В се же время приде Бонякъ с половци Кыеву. Того ж лета сдея Гд6ь въ тъ дн6ь сп6сенье велико мц6а иоулия в ³7і7дн6ь побежены быша иноплеменьцы и князя ихъ uбиша Тугоркана. Въ к7 тогожъ мц6а въ пятокъ приде Бонякъ безбожныи шелудивыи отаи хыщьникъ г Кыеву внезапу и мало в градъ не въехаша.

7

В ле6т ¤s777х7³7 преставися Всеславъ Половьцьский князь априля въ д7і7 день въ ³ час дне въ среду.

8

В ле6т ¤s777х7і7з7 Изяславъ же идее г Кыеву се же бысть мц6а августа въ к7г7 дн6ь во вторник.

9

В ле6т ¤s777х7…s7 заложи Андреи князь в Володимери црк6вь камену ст7ую Бц6ю мц6а априля въ и7 въ дн6ь ста6го ап6ла Родиона во вторник.

10

В ле6т ¤s777х7п7а7 преставися благоверныи князь Мстиславъ Андреевичь мц6а марта въ к7и7 дн6ь во вторникъ.

11

В леб̃т ¤s777x7п7г7 убиен бысть кн6зь Андреи мца июня на память ст6ых ап6лу Петра и Павла в субботу на ночь. И о свете заЕтра мертвъ в неделю на память в7і7 апостолъ. Вземше тело его въ е7 дн6ь къ четвергъ.

12

В ле6т ¤s777xп77г7. Тое ж зимы оженися Ярополк Ростиславичь князь Володимерьский пославъ Смолиньску поя за ся княгыню Всеславлю дочерь князя Витепьскаго и венчася с нею въ Володимери Е ст6ое Бц6и мц6а генваря въ г7 дн5ь мясопустное недели во второк.

Вызначыць дзень

1

В ле6т ¤s777x7е7і7 Ст6ополкъ же придее в Печерьскыи монастырь на заЕтреню на Еспенье ст6ыя Бц6а.

2

В ле6т ¤s777x7л7г7 бысть пожар велик Кыеве городе яко погоревшю ему мало не всему на ржт6во Иоанна Предтечи.

3

В ле6т ¤s777x7м7 Ярославъ же остави брата Ст6ополка в Полотске и прииде в Переяславль на Гж6инъ дн6ь. Полочане же рекша лишается нас и выгнаша Ст6ополка а Василка посадиша Сто6славича.

4

В ле6т ¤s777x7о7з7 чюдо створи Бг6ъ и ста7я Бц6а изгна бо злаго и пронырливаго и гордаго льстеца лжаго влд6ку Феодорца мц6а мая на дн6ь ста6го Иоанна Богословца.

5

В ле6т ¤s777x7п7е7 и побеже Мстиславъ и дружине его мц6а июня на память ст6аго Сампсона страньноприимца.

6

В ле6т ¤s777x7п7s7 князь же Всеволодъ взя городъ Торжекъ мц6а декамбря на память святого Потапья.

7

В ле6т ¤s777x7В7г777 Постави Луку епп6мъ Ростову и Володимерю и Суждалю и всеи земли Ростовьскои поставленъ же бысть мц6а марта на память стаго Софронья архиеп6па Ермльского.

8

В ле6т ¤s777x7В7г7 бысть пожаръ великъ в Володимери граде мц6а априля на память ста6го Семеона.

9

В ле6т ¤s777x7В7е7 на перенесенье сто6ю мч7нку Бориса и Глеба родися Е Всеволода князя великаго сн6ъ и нарекоша имя ему в ст6мъ крщ6нии Борисъ.

Того жъ лета Всеволодъ Юргевичь отдалъ дчерь свою Вселаву Чернигову

за Ярославича Ростислава внука Всеволожа Ольговича и ведена бысть мц6а иуля на память ст6ое мц7ы Еуфимьи.

10

В ле6т ¤s777х7΄7 мц6а июля на память ста6го мчк6а Евстафья быша постригы у великаго князя Всеволода сыну его Георгиеви въ граде Суждали того дни и на конь его всади.

Комплексныя заданнi

1

В ле6т¤s777х7к7в7 бы6с знаменiе въ слн7ци въ а7 часе дне бы6с видели все людие остася его мало акы месяц долу рогома мц6а марта въ ³7i7 же ле6т преставися бл7гверныи князь Михаил зовомый Ст7ополкъ мц6а априля въ s7i7 дн6ь того мц6а к7 вниде Володимеръ в Кыевъ в неделю в то же лето поставиша Данила епп6мъ мц6а генваря на Крщ7нье Гн6е.

2

В ле6т ¤s777х7п7е7 въ субботу заходящу солнцу на память ста6го отца Мефодья.

В ле6т ¤s777х7п7е7 Всеволодъ князь в понедельникъ Феодоровы недели възъвратися с победою великою въ Володимерь.

4

В ле6т ¤s777х7В7г7 мц6а иуня въ л7а7 дн6ь в понедельникъ на память ста6го Евдокима сдея гд6ь спс7нье велико нашим князем и воем ихъ надъ врагы нашими и побежены быша иноплеменьницы.

5

В ле6т ¤s777х7В7д6 мц6а мая въ л7 дн6ь на память ста6го прр7ка Иеремия в середу на вечерни бысть знаменье въ сл7нци и морочно бысть вельми яко и звезды видети человекомъ ко очью яко зелено бяше и въ сл6нце учинися яко мц6ь изъ рогъ его яко угль жаровъ изхожаше страшно бе видети члк6омъ знаменье Бж6ье. В то же ле6т того ж мц6а на память ста6го мчк6а Потапья в субботу родися сн6ъ у великого кн6зя Всеволода и нарекоша имя ему въ ст6мъ крщ6нии Костянтинъ.

6

В ле6т ¤s777х7΄7а7 бысть пожаръ в Володимери городе мца июня к7г7 въ стобю мчк6у Бориса и Глеба въ четвергъ въ полночи зажжеся и горе мало не до вечера. Церкви изгореша д7i7 а города половина погоре а княжъ дворъ избавленъ бысть от пожара.

**Пытанні да заліку**

1 курс 2 семестр

1. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны ў сістэме гістарычных навук.
2. Палеаграфія як навука.
3. Дахрысціянская пісьменнасць. Паходжанне славянскай пісьменнасці. Кірыліца.
4. Помнікі пісьменнасці ўсходнеславянскіх народаў.
5. Устаў як тып кірылічнага пісьма.
6. Паўустаў як тып кірылічнага пісьма.
7. Скарапіс як тып кірылічнага пісьма.
8. Гістарычная метралогія як навука.
9. Старажытная метралогія. Сістэма вымярэнняў ў перыяд XI-XV ст.
10. Метралогія XV-XVII ст.
11. Метралогія XVIII- XX ст.
12. Сфрагістыка як навука. Тэарэтычная сфрагістыка.
13. Пячаткі X-XIII стст.
14. Пячаткі з XIV-да 1917 г.
15. Геральдыка як навука.
16. Паняцце герба. Гербы уласныя, гарадскія, аб’яднанняў. Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь.
17. Тэарэтычная геральдыка. Блазаніраванне гербоў.
18. Гістарычная храналогія як навука.
19. Час і яго вымярэнне. Паняцце эры.
20. Каляндары і прынцыпы іх пабудовы. Старажытныя каляндары.
21. Юліянскі, грыгарыянскі і новаюліянскі каляндары.
22. Каляндар французскай рэвалюцыі. Праекты сусветнага каляндара.
23. Нумізматыка як навука. Тэарэтычная нумізматыка.
24. Пачатак грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі. Перыяд рымскага дэнарыя. Першы безманетны перыяд.
25. Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі ў VIII-XIV ст. Перыяд куфічнага дырхема і заходнееўрапейскага дэнарыя. Другі безманетны перыяд.
26. Грашовае абарачэнне на Беларусі канца XIII-XV ст. Перыяд пражскага гроша.
27. Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі у XVI-першай палове XVII ст.
28. Грашовае абарачэнне Беларусі ў другой палове XVII-XVIII ст.
29. Грашовае абарачэнне Беларусі канца XVIII ст. па 1917 г.
30. Грашовае абарачэнне Беларусі ў савецкі час.
31. Гістарычная анамастыка. Антрапаніміка.
32. Гістарычная анамастыка. Тапаніміка.

# ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## Гласарый

**Гістарычная крыніца** – гэта ўсе рэшткі мінулага, якія звязаны з дзейнасцю людзей і адлюстроўваюць гісторыю чалавечаскага грамадства.

**Рэчывыя крыніцы** – створаныя чалавецтвам з моманту яго з'яўлення матэрыяльныя (якія можна памацаць рукамі) прадметы.

**Пісьмовыя крыніцы** - дакументы, аналы, гістарычныя даследаванні, мемуары, іншыя літаратурныя творы. Матэрыялам для пісьмовых крыніц служыць усё, на чым можна пісаць: папера, скура (пергамент), папірус, дрэва і драўняная кара, косць, гліна, камень, метал.

**Палеаграфія** – дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая займаецца вывучэннем знешніх прызнакаў помнікаў пісьменнасці. Назва навукі ўтварылася ад слоў "палайос" (παλαιός) – старажытны і "графа" (γράφω) - пішу.

**Геральдыка** – гэта дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае дзяржаўныя, гарадскія, асабовыя гербы, а таксама гербы ўстаноў і аб'яднанняў, а таксама займаецца іх апісаннем і стварэннем новых гербоў па строга акрэсленых правілах.

**Герб** – гэта сімвалічная вызначальна-прававая выява, прадстаўленая на падставе вядомых, дакладна акрэсленых правілаў, якая служыць пастаянным знакам адрознення асабістаму ліцу, роду, згуртаванню або ўстанове, вобласці ці дзяржаве, і зацверджаная дзяржаўнай уладай.

**Гістарычная храналогія** з'яўляецца адной з самых значных дапаможных гістарычных дысцыплін – яна адлюстроўвае найбольш значны параметр гісторыі – гістарычны час.

**Сфрагістыка** (ад грэчаскага Σφραγις – "пячатка") – дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае пячаткі, а таксама гісторыю іх узнікнення і існавання. Сфрагістыка можы мець іншую назву – ***сігілаграфія*** (ад лацінскага sigillum – пячатка + грэчаскае γραφο – пішу = "апісанне пячатак").

**Выява** пячаткі прадстаўляе сабой малюнак, выразаны на працоўнай паверхні матрыцы.

**Легенда** – гэта літарны надпіс, які служыць дадаткам да выявы і ў той жа час абумоўлены выкарыстаннем выявы, а таксама зацвярджае прыналежнасць пячаткі пэўнай асобе або ўстанове.

**Гістарычная метралогія** – дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая займаецца вывучэннем узнікнення і развіцця розных мер: даўжыні, плошчы, вагі і аб'ёма, іх суадносіны, а таксама ўтварэнне, ужыванне і змяненне з цягам часу сістэм вымярэння ў гаспадарцы розных народаў.

**Нумізматыка** (ад лацінскага nomisma – "манета") – гэта навука, якая вывучае паходжанне манет, гісторыю ўзнікнення і развіцця грашова-вагавых сістэм, грашовага абарачэння і манетнай вытворчасці.

**Манета** – металічны знак, часцей дыскападобнай формы, на абодва бакі якога

нанесены клеймы ў выглядзе выяў і легенд (надпісаў), якія выступаюць у ролі знакаў якасці, гарантуемых імітэнтам (правіцелем) або дзяржавай.

**Манетная стапа** – строга азначаная колькасць манет, якая павінна быць зроблена з азначанай вагавай колькасці метала.

**Проба** – працэнтныя суадносіны паміж колькасцю каштоўнага метала і лігатуры ў манеце. Тэрмін проба (ад лацінскага probo – “правяраю, ацэньваю) выкарыстоўваецца пры чаканцы манет з каштоўных металаў: золата, серабра, плаціны і адлюстроўвае змест каштоўнага метала ў сплаве, з якога зроблена рэч. Існуюць чатыры сістэмы проб: *метрычная*, *каратавая*, *залатніковая* і *лотавая*.

**Намінал** – абазначэнне дастоінства на манетах і папяровых грошах. Спачатку наміналы атрымлівалі сваю назву ад вагавых адзінак, якім яны адпавядалі, потым вага манеты мянялася, а назва заставалася.

**Вучэбная праграма**
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________А.В. Макоўчык
«___»___________2021 г.
Рэгістрацыйны № УД-___/вуч.

НАВУКОВАЯ КРЫТЫКА ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦЫ
Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасцей:

1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

2021 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйных стандартаў па спецыяльнасцях 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны, 1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура, 1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа (зацв.____________ ад ______ рэгістрацыйны №____) і вучэбных планаў

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**І.Л. Калечыц**, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

**С.А.Талмачова**, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў гістарычнага факультэта БДПУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

**С.В. Паноў**, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі РІВШ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар дзяржаўнай установы
адукацыі «Сярэдняя школа № 182» У.У. Крайноў

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай усеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі
(пратакол № 3 ад 29 кастрычніка 2021 г.)
Загадчык кафедры А.А. Корзюк

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № ад 2021).

Афармленне вучэбнай праграм і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.
Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела Г.В. Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П. Сяткоўская

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навуковая крытыка дае выпрацаваныя дасведчаным шляхам правілы, як трэба ставіцца да вестак, якія змяшчаюцца ў гістарычных крыніцах розных катэгорый. Пад гістарычнай крыніцай даследчыкі разумеюць усе рэшткі мінулага, якія звязаныя з дзейнасцю людзей і адлюстроўваюць гісторыю і заканамернасці развіцця чалавечага грамадства. Гістарычныя крыніцы могуць быць пісьмовымі і рэчавымі. Для працы з імі выкарыстоўваюцца дапаможныя гістарычныя дысцыпліны, якія накіраваны на вывучэнне гістарычнай крыніцы, а праз гэта – на вызначэнне дакладнасці гістарычнага факта, які змяшчаецца ў ёй.

Паспяховае прымяненне навуковай крытыкі гістарычнай крыніцы магчыма толькі пры атрыманні навыкаў працы з крыніцай, выкарыстанне спецыфічных методык і тэхнічных прыёмаў, валоданне якімі неабходна гісторыку.

Вучэбная дысцыпліна заснавана на ведах, атрыманых пры вывучэнні наступных дысцыплін спецыяльнасці: “Археалогія Беларусі”, “Этналогія Беларусі”, “Краязнаўства Беларусі”. Гэта дае магчымасць акцэнтаваць увагу студэнтаў на міждысцыплінарных сувязях, карыстацца атрыманымі ведамі ў першапачатковай крытыцы гістарычных крыніц.

Метадалагічную аснову вучэбнай дысцыпліны складаюць асноватворчыя прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці, каштоўнаснага падыходу, а таксама агульнанавуковыя і канкрэтна-гістарычныя метады пазнання ў спалучэнні з сучасным навуковым катэгарыяльным і паняційным апаратам.

**Мэта вучэбнай дысцыпліны** авалоданне галоўнымі тэарэтычнымі і практычнымі метадамі і прыёмамі даследавання пісьмовых і рэчавых гістарычных крыніц.

Для рэалізацыі пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы**:

- засваення навыкаў чытання і палеаграфічнага аналіза пісьмовых помнікаў як гістарычных крыніц;
- авалодання ведамі ў галіне храналогіі, метралогіі, нумізматыкі, анамастыкі, антрапанімікі, тапанімікі, геральдыкі, сфрагістыкі і ўменнямі выкарыстоўваць іх пры вывучэнні гістарычных крыніц;
- авалоданне ўменнямі выкарыстоўваць даныя навуковай крытыкі гістарычнай крыніцы для арганізацыі вучэбнай і пазакласнай працы настаўніка гісторыі і ў працы гісторыка-вучонага.

У выніку вывучэння навучальнай дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць**:

- асноўныя палажэнні тэорыі і методыкі даследавання гістарычных крыніц;
- метады і прыёмы навуковай крытыкі гістарычных крыніц;

**умець**:

- выкарыстоўваць дадзеныя палеаграфіі для чытання, датавання і вызначэння сапраўднасці старажытных пісьмовых крыніц;
- вызначаць тып тэксту (устаў, паўустаў, скарапіс) і прыкладны час напісання тэксту;
- пераводзіць даты розных каляндарных сістэм ў пісьмовых крыніцах на сучаснае летазлічэнне;
- ведаць асноўныя правілы геральдыкі і для характарыстыкі герба як гістарычнай крыніцы;
- знаходзіць даныя метралогіі, нумізматыкі, анамастыкі, геральдыкі і сфрагістыкі і выкарыстоўваць іх ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі.

**валодаць**:
- прыёмамі і метадамі навуковай крытыкі гістарычнай крыніцы;
- метадамі навуковай крытыкі гістарычнай крыніцы ў выкладанні гісторыі ў школе.
- навыкамі навуковай работы з крыніцамі;
- метадамі дапаможных гістарычных дысцыплін пры правядзенні гістарычнага даследавання;

Патрабаванні да ўніверсальных і базавых кампетэнцый:

СК-5 – выкарыстоўваць археалагічны і гісторыка-краязнаўчы матэрыял, даныя нумізматыкі, палеаграфіі, геральдыкі, храналогіі ў вывучэнні і выкладанні гісторыі, а таксама для вырашэння даследчых задач.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны» па спецыяльнасцях 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны, 1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура і 1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа вучэбным планам адводзіцца ўсяго 90 гадзін (3 зач. адз.), з іх: аўдыторных – 48 гадзін (18 гадзін – лекцый, 10 гадзін – практычных і 20 гадзін – семінарскіх заняткаў, з іх 6 гадзін – кіруемая самастойная работа студэнта), на самастойную працу – 42 гадзіны. Форма кантролю: залік у другім семестры.

На завочнай форме атрымання адукацыі па спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны навучальным планам адводзіцца ўсяго 98 гадзін, з іх 12 аўдыторных гадзін: 4 гадзіны – лекцый, 8 гадзін – семінарскіх заняткаў). У працэсе вывучэння дысцыпліны студэнты здаюць залік на 2 курсе.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Паняцце гістарычнай крыніцы. Пісьмовыя і рэчавыя крыніцы.**

Рэчавыя і пісьмовыя крыніцы. Паняцце гістарычнай крыніцы.

Выкарыстанне навуковай крытыкі гістарычнай крыніцы ў рабоце настаўніка гісторыі. Гістарычныя крыніцы як сведчанні мінулага, якія звязаны з дзейнасцю людзей і адлюстроўваюць гісторыю чалавечага грамадства. Выкарыстанне разнастайных гістарычных крыніц пры аднаўленні сапраўднай карціны гістарычнага мінулага.

**Тэма 2. Роля дапаможных гістарычных дысцыплін у вывучэнні гістарычнай крыніцы.**

Знешняя і ўнутраная крытыка крыніц. Атрыманне інфармацыі пра паходжанне крыніцы. Устанаўленне часу і месца складання крыніцы, аўтарства, умоў яе напісання, сапраўднасці, аднаўленнем першапачатковага тэксту з дапамогай дапаможных гістарычных дысцыплін.

Аналіз тэксту, уласных імёнаў, геаграфічных звестак, і інш. з дапамогай дапаможных гістарычных дысцыплін.

Вызначэнне ступені правамернасці выкарыстання крыніцы ў навуковым даследаванні як мэта знешняй крытыкі крыніцы.

**Тэма 3. Палеаграфія і яе значэнне для вывучэння гістарычнай крыніцы.**

Выкарыстанне даных палеаграфіі ў навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы. Вызначэнне часу і месца стварэння, іх сапраўднасці ці падробленасці, аўтараў рукапісаў. Паняцце звода, ізвода, пратографа, спіса. Сувязь з эпіграфікай, храналогіяй, археаграфіяй, дыпламатыкай, берасталогіяй і філіграналогіяй.

Паходжанне славянскай пісьменнасці. Сведчанні аб існаванні дакірылічнай пісьменнасці. Кірыліца і глаголіца: пытанні аб часе ўзнікнення, аўтарстве і першаснасці. Кірыліца. Паходжанне і гукавае значэнне літар. Абазначэнне лічбаў літарамі. Надрадковыя знакі. Помнікі пісьменнасці ўсходнеславянскіх народаў.

Выкарыстанне палеаграфічных матэрыялаў у працы настаўніка гісторыі.

**Тэма 4. Графічныя тыпы кірылічнага пісьма ў гістарычных крыніцах.**

Прычыны змянення графікі пісьма. Устаў, паўустаў і скорапіс і вязь як графічныя тыпы кірылічнага пісьма. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма.

Матэрыял і прылады для пісьма, іх значэнне для навуковай крытыкі гістарычнай крыніцы. Пергамен: гісторыя ўзнікнення, тэхналогія выпрацоўкі, палімпсесты. Папера: гісторыя ўзнікнення, тэхналогія вырабу, бамбіцына, філіграні. Выраб паперы ў Рэчы Паспалітай, гербы на вадзяных знаках. Выкарыстанне бяросты і цэры, стыляў як прылад для пісьма. Чарніла і фарбы, выкарыстанне золата і серабра. Гусіныя пёры, алоўкі, пэндзалі, хараксала,

кружала і іншыя прылады для пісьма і аздаблення. Фармат рукапісаў.

Вязь як від дэкаратыўнага пісьма, лігатурыраванне, штамбаванне, паказчык вязі і іх значэнне для датавання гістарычнай крыніцы.

Упрыгожванні рукапісаў і іх значэнне для крытыкі гістарычнай крыніцы: арнаменты, застаўкі, ініцыялы, калафоны.

Віды арнаментаў: старавізантыйскі або геаметрычны, тэраталагічны, новавізантыйскі, балканскі, старадрукаваны арнамент, барока, ракако, стыль Людовіка XVI, ампір. Мініяцюры.

**Тэма 5. Гістарычныя крыніцы, напісаныя ўставам: характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне.**

Графіка літар ва ўстаўным пісьме і аздабленне рукапісаў. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма. Характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне пісьмовых помнікаў XI ст. як гістарычных крыніц. Характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне пісьмовых помнікаў XII ст. як гістарычных крыніц. Характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне пісьмовых помнікаў XIII ст. як гістарычных крыніц.

**Тэма 6. Гістарычныя крыніцы, напісаныя паўставам: характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне.**

Графіка пісьма ў паўустаўным пісьме. Праблема змены графікі літар. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма. Характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне пісьмовых помнікаў XIV ст. як гістарычных крыніц. Характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне пісьмовых помнікаў XV ст. як гістарычных крыніц. Аздабленне рукапісаў.

**Тэма 7. Гістарычныя крыніцы, напісаныя скорапісам: характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне.**

Графіка пісьма ў скарапісным пісьме. Праблема змены графікі літар. Методыка вызначэння графічнага тыпу пісьма. Характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне пісьмовых помнікаў XVI ст. як гістарычных крыніц. Характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне пісьмовых помнікаў XVII ст. як гістарычных крыніц. Характэрныя прыкметы, чытанне і датаванне пісьмовых помнікаў XVIII ст. як гістарычных крыніц.

**Тэма 8. Герб як гістарычная крыніца.**

Герб як крыніца вывучэння геральдыкі. Тэарэтычная геральдыка. Асноўныя геральдычныя тэрміны. Віды гербоў.

Састаўныя часткі герба: шчыт, шлем, карона, бурэлет, клейнод, намёт, мантыя, дэвіз, пастамент. Віды шчытоў. Геральдычныя фігуры: фігуры дзялення, геральдычныя фігуры першага і другога парадку, негеральдычныя фігуры (натуральныя, штучныя і фантастычныя). Эмалі, металы і футры. Асноўнае правіла геральдыкі. Шрафіроўка. Блазаніраванне герба.

**Тэма 9. Гарадскія і ўласныя гербы на тэрыторыі Беларусі ў гістарычнай рэтраспектыве.**

Гарадскія і ўласныя гербы Беларусі як гістарычная крыніца. Гісторыя ўзнікнення гербоў на тэрыторыі Беларусі. Уласныя гербы. Знакі Рурыкавічаў. "Сарматызм" і "рымскае паходжанне" шляхты. Адметныя рысы беларускіх ўласных гербаў.

Гарадскія гербы і ўласныя гербы ў часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Гарадскія і ўласныя гербы на тэрыторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Гарадскія гербы пасля 1917 г., перыяд "турысцкага значыка", перыяд адраджэння. Уласныя гербы пасля 1917 г. Даследаванне ўласных гербоў як гістарычнай крыніцы. Адраджэнне гербавай сімволікі: асноўныя шляхі і тэндэнцыі.

Гербы аб'яднанняў як гістарычныя крыніцы. Гісторыя ўзнікнення і існавання. Дзяржаўныя гербы Рэспублікі Беларусь: гісторыя стварэння і існавання.

**Тэма 10. Гарадскія гербы Рэспублікі Беларусь як гістарычныя крыніцы: блазаніраванне і выкарыстанне даных.**

Навуковая крытыка геральдычных крыніц. Правілы блазаніравання. Віды шчытоў і ўмовы іх выкарыстання. Эмалі і металы на гарадскіх гербах. Геральдычныя і негеральдычныя фігуры на гарадскіх гербах. Фігуры дзялення на гарадскіх гербах.

Гісторыя стварэння і існавання гарадскіх гербоў. Гарадскія гербы ў ВКЛ, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі: узнікненне, існаванне і змена знешняга выгляду. Адраджэнне і наданне гарадскіх гербоў у Рэспубліцы Беларусь.

**Тэма 11. Гістарычная храналогія ў навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы.**

Выкарыстанне даных матэматычнай (астранамічнай) і гістарычнай храналогіі ў навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы. Тэарэтычныя і практычныя задачы гістарычнай храналогіі ў навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы. Узнікненне і развіццё храналогіі як дапаможнай гістарычнай дысцыпліны. Датаванне гістарычных падзей і крыніц. Датаванне па ўскосных даных. Выкарыстанне матэрыялаў гістарычнай храналогіі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі.

**Тэма 12. Асноўныя тэрміны гістарычнай храналогіі: час і яго вымярэнне.**

Асноўныя паняцці гістарычнай храналогіі: год, месяц, тыдзень, суткі, гадзіна. Стварэнне старажытных каляндароў на аснове месяцовага, сонечнага і месяцова-сонечнага года. Метонаў цыкл. Удасканаленне каляндарных сістэм.

Старажытныя каляндарныя сістэмы: старажытнаегіпецкая, вавілонская, старажытнагрэчаская, рымская, старажытнаяўрэйская. Юліянскі, грыгарыянскі і новаюліянскі каляндар. Мусульманскі каляндар. Каляндар французскай

рэвалюцыі. Спробы стварэння сусветнага каляндара. Сістэма вымярэння часу ўсходнеславянскімі народамі.

Паняцце эры. Сакавіцкі, ультрасакавіцкі, вераснёўскі і студзеньскі стылі. Назвы месяцаў і дзён тыдня.

Методыка храналагічных даследаванняў.

**Тэма 13. Вызначэнне дат гістарычных падзей у пісьмовых крыніцах.**

Гістарычны час як асноўная катэгорыя ў працы гісторыка. Праца з датамі падзей ў пісьмовых крыніцах.

Перавод дат на сучасную сістэму летазлічэння. Вызначэнне года ад стварэння света і перавод на даты нашай эры. Вызначэнне даты падзеі. Пераходзячыя і непераходзячыя святы. Вызначэнне дня святкавання Пасхі. Вызначэнне дня тыдня. Формула Беражкова.

**Тэма 14. Пячаткі як гістарычныя крыніцы**

Выкарыстанне метадаў сфрагістыкі для навуковай крытыкі гістарычнай крыніцы. Прадмет, аб’ект і задачы сфрагістыкі. Крыніцы вывучэння сфрагістыкі. Развіццё сфрагістыкі як дапаможнай гістарычный дысцыпліны.

Паняцце пячаткі. Паняцце матрыцы і адбітка. Сфрагістычная тэрміналогія: працоўная паверхня, выява, легенда. Віды пячатак: прывесістыя, прыціскныя, прыкладныя, маліўдавулы, аргіравулы, хрысавулы, васковыя, воска-масцічныя, масцікавыя, курадымныя пячаткі.

Методыка даследавання пячатак як гістарычных крыніц.

**Тэма 15. Пячаткі на тэрыторыі Беларусі: гісторыя існавання, матэрыял, мова, сфера выкарыстання.**

Знешні выгляд, матэрыял і мова ў даследаванні пячатак як гістарычнай крыніцы.

Пячаткі на тэрыторыі пражывання ўсходніх славян: першыя ўпамінанні і праблема знешняга выгляду. Пячаткі X ст. Пячатка Ізяслава Ўладзіміравіча: знешні выгляд і сувязі з геральдычнай традыцыяй (знакі Рурыкавічаў). Булы архаічнай традыцыі, грэка-рускія пячаткі. Пячаткі XII–XIII ст.: знешні выгляд і матэрыял. Пячаткі епіскапаў, князёў, жаночыя пячаткі: знешні выгляд і адрозненні. Пячаткі ДЬНЕСЛОВО.

Пячаткі XV–XVIII стст.: знешні выгляд, мова і матэрыял адбіткаў, заканадаўчае пацверджанне прымянненя пячатак. Пячаткі уласныя і дзяржаўныя. Пячаткі XIX–XX стст.

**Тэма 16. Даныя гістарычнай метралогіі ў гістарычных крыніцах**

Метады гістарычнай метралогіі ў навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы. Роля метралогіі ў гістарычных даследаваннях. Прадмет і задачы гістарычнай метралогіі. Пісьмовыя і археалагічныя помнікі як крыніцы гістарычнай метралогіі. Сувязь метралогі з іншымі навукамі.

Метралагічныя крыніцы. Гісторыя станаўлення і развіцця метралогіі.

Практычнае выкарыстанне даных метралогіі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі.

**Тэма 17. Меры даўжыні, плошчы, вагі і аб’ёма ў гістарычных крыніцах ад старажытных часоў да XX ст.**

Пісьмовыя і археалагічныя крыніцы аб метралогіі ўсходнеславянскіх народаў. Прыблізнасць вымярэнняў. Меры даўжыні, паверхні, вагі і аб’ёму сыпкіх і вадкіх рэчываў.

Пісьмовыя крыніцы аб мерах у Вялікім княстве Літоўскім, Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржаве. Наўгародская і Маскоўская сістэмы. Уніфікацыя мер. Меры даўжыні, плошчы, вагі, аб’ёма, меры падаткаабкладання.

Выкарыстанне англійскіх мер і змена ў сувязі з гэтым мер даўжыні і паверхні. Удакладненне мер у сувязі з развіццём капіталістычных адносін. Метрычная сістэма мер і пытанне аб яе ўвядзенні. Увядзенне метрычнай сістэмы мер. Яе характарыстыка. Эталоны мер.

**Тэма 18. Манеты як гістарычныя крыніцы**

Манеты як гістарычныя крыніцы. Выкарыстанне даных нумізматыкі ў навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы.

Нумізматыка як дапаможная гістарычная дысцыпліна. Баністыка, фалерыстыка. Скарбы як асноўны аб’ект для нумізматычных даследаванняў. Віды і датаванне скарбаў. Сувязь нумізматыкі з іншымі навукамі. Аналіз літаратуры па нумізматыцы. Гісторыя ўзнікнення нумізматыкі.

Выкарыстанне даных нумізматыкі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі. Нумізматычная тэрміналогія. Грошы, іх віды і функцыі.

**Тэма 19. Грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларусі са старажытных часоў да XX стст.**

Паступленне манет на тэрыторыю Беларусі. Антычныя манеты на беларускай зямлі. Першы безманетны перыяд. Арабскія, візантыйскія, кіеўскія і наўгародскія манеты. Заходнееўрапейскія дэнарыі. Шляхі паступлення манет. Геаграфія размяшчэння скарбаў. Другі безманетны перыяд. Дыскусія аб яго прычынах. Літоўскія, кіеўскія, наўгародскія і чарнігаўскія грыўні.

Манеты XIV-XVI стст. на тэрыторыі Беларусі. Грашовае абарачэнне ў XIV-XVI стст. Пражскі грош. Літоўскія дэнарыі. Манеты Польшчы, Лівонскага ордэна, Залатой арды і іншых краін.

Манеты Вялікага княства Літоўскага як гістарычная крыніца. Узаемаадносіны паміж манетамі Вялікага княства Літоўскага і польскімі манетамі. Талеры. Чаканка білонавых манет. Паступленне на тэрыторыю Беларусі манет Лівоніі, шведскай Прыбалтыкі, Расіі, Прусіі і іншых краін.

Манеты ў XVII – XVIII стст. на тэрыторыі Беларусі. Фінансавы крызіс. Чаканка меднай, білонавай і сярэбранай манеты. Барацінкі і тымфы. Манеты Расіі і Прусіі.

Манеты на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – XX стст. Асаблівасці грашовага абарачэння Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Увядзенне залатога монаметалізму.

Грашовае абарачэнне ў час першай сусветнай вайны.

Грашовая сістэма ў савецкі час. Развал грашовай сістэмы ў час грамадзянскай вайны. Падрыхтоўка і правядзенне грашовай рэформы 1922-24 гг. Чаканка бронзавых і нікелевых манет. Грашовыя рэформы 1947 і 1961 гг. Юбілейныя і памятныя манеты. Грашовая сістэма ў канцы XX – пачатку XXI ст.

**Тэма 20. Гістарычная анамастыка ў даследавання гістарычных крыніц**

Выкарыстанне гістарычнай анамастыкі ў навуковай крытыцы гістарычных крыніц. Прадмет і задачы гістарычнай анамастыкі. Тапаніміка, этнаніміка і антрапаніміка.

Сувязь анамастыкі з мовазнаўствам, гісторыяй, геаграфіяй, сацыялогіяй і іншымі дысцыплінамі. Сацыяльная абумоўленасць асабістых імён.

Фарманты асабістых імён і іх вывучэнне. Выкарыстанне даных анамастыкі ў гістарычных даследаваннях і працы настаўніка гісторыі. Літаратура па тэме, яе аналіз.

**Тэма 21. Тапонімы і антрапонімы ў гістарычных крыніцах**

Даныя антрапанімікі ў навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы. Сацыяльная абумоўленасць асабістых імён у мінулым. Дахрысціянскія і хрысціянскія імёны. Княжацкія імёны. Жаночыя і мужчынскія імёны. Прозвішчы і мянушкі. Асаблівасці прозвішчаў і імён у розных сацыяльных групах. Імянная мода.

Даныя антрапанімікі ў навуковай крытыцы гістарычнай крыніцы. Сувязь тапанімікі з мовазнаўствам, гісторыяй і геаграфіяй. Тапанімічная тэрміналогія. Мікратапаніміка, макратапаніміка і мезатапаніміка. Адлюстраванне ў геаграфічных назвах этнагенезу, міграцыі насельніцтва, эканамічнага, палітычнага і сацыяльнага жыцця грамадства. Тапанімічны субстрат. Гідронімы. Назвы населеных пунктаў. Тапаніміка Беларусі і роднага краю. Угра-фінскія, балцкія, славянскія і іншыя назвы геаграфічных аб’ектаў на тэрыторыі Беларусі.

**Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны»**
**(дзённая форма атрымання адукацыі для спецыяльнасцяў 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны, 1-01 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура і 1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа)**

